КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 28 (1519)
10 ліпеня 2021 г.

14 ліпеня адбудзецца юбілейны, 30-ты па ліку, Міжнародны фестываль мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”!

Наш Рушнік, які яднае і аберагае

Святкаванне Купалля — старажытная беларуская традыцыя, якая беражліва захавана і ўшанавана ў нашай краіне. Самая незвычайная ноч у годзе, якая прысвечана летняму сонцастаянню і росквіту прыроды, кожны год яскрава адзначаецца ў Александрыі. Аграгарадок Шклоўскага раёна за гэты час стаў візітнай карткай аднаго з найстарадаўнейшых народных свят. Сваіх сяброў Александрыя збірае і сёлета. Купалле ў гэтым годзе святкуюць традыцыйна — на беразе ракі Дняпро, якая са старажытных часоў згуртоўвае тры ўсходнеславянскія народы. Асноўная пляцоўка свята разгортваецца менавіта каля маста, які яднае не толькі два населеных пункта — Александрыю і Копысь, але і две вобласці — Магілёўскую і Віцебскую. Усе гэтыя сімвалы набылі новы сэнс, улічваючы тое, што 2021 год быў абвешчаны Годам народнага адзінства.

Працяг тэмы — на старонцы 2



ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Наш Рушнік, які яднае і аберагае

Сімвалам рэспубліканскага свята абраны рушнік. *“Рушнік — суправаджае нашага чалавека ад нараджэння да смерці. Паміж таго, ён сустракаецца ва ўсіх славянскіх культурных святах, дзеях. На маю думку, наш рушнік у якасці традыцыйнага сімвала дазволіць у чарговы раз засяродзіцца на самабытнай культуры беларускага народа ды й пакажа адзінства славянскай культуры”*, — зазначыў намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама **Валерый Малашка**.

Гасцей Александрыі сустракаюць гандлёвыя рады і міні-павільёны, атракцыёны, выставы-продажы, тэматычныя пляцоўкі. І цырымонія адкрыцця, і гала-канцэрт народнага шоу “Песні маёй краіны” — традыцыйна сталі асноўнымі падзеямі свята.

Пра навацыі на гала-канцэрце “К” даведалася ў дырэктара Магілёўскай абласной філармоніі Святланы Ефімук.

— У гэтым годзе асноўная ідэя і пасыл нашага гала-канцэрта — яднаць людзей. Намі быў абраны цікавы фармат: песні па заявах. Можна сказаць, што гледачы самі складаюць канцэртную праграму і чуюць ад артыстаў блізкія і знаёмыя песні, якія адклікаюцца ў іх сэрцы. Таму мы і назвалі наша мерапрыемства “Песні маёй краіны”. Вы можаце пабачыць, як крэатыўна прадумана і галоўная сцэна. Яна складаецца з двух аб’ектаў — паўсфер, для хору і для аркестра, а ў цэнтры размешчана крутная сфера, якая дазваляе хутка змяняць дэкарацыі і акунаць гледача ў неабходную атмасферу. Спадзяюся, што наша свята атрымалася!

■ Пачнецца мерапрыемства на галоўнай канцэртнай пляцоўцы ў 21:00. У ім прымуць удзел зоркі беларускай эстрады Алёна Ланская, Жанэт, Вікторыя Алешка, Уладзімір Громаў, Анастасія Масквіна, групы “Беларусы”, “Верасы”, ансамблі “Песняры”, “Сябры”. Да нас прыедуць госці Кастусь Масковіч, Сержык, Алег Газманаў.

Ганна БАРАНОК

Газета — рэгіёны — чытач

■ — Школы мастацтваў у рэгіёнах выхоўваюць таленавітую моладзь, і таму іх дабрабыту трэба надаваць асаблівую ўвагу. Як ідуць справы ў Рагачоўскай школе мастацтваў, дзе зараз вучацца каля 800 чалавек?

Дырэктар дзіцячай школы мастацтваў горада Рагачова Алег Чаплыгін:

— Калі гаворка ідзе пра наш будынак, то адзначу, што ён у добрым стане. Штогод мы падтрымліваем парадак касметычным рэмонтам, а год таму, калі школа адзначыла юбілей, адміністрацыя горада падарыла нам сертыфікат на восем тысяч рублёў на замену ваконных блокаў.

У музычных інструментах у нас няма нястачы ды, наколькі я ведаю, і ў іншых школах нашага раёна: у 2017 годзе ад дзяржавы Рагачоў атрымаў 5 новых піяніна і яшчэ некалькі піяніна ад спонсараў, так што з дапамогай мясцовых улад мы задаволілі патрэбу і гарадской, і раённых школ. У тым жа годзе ад спонсара наша школа атрымала ў падарунак прафесійную гітару. На базе школы дзейнічае 4 “народных” і “абразцовых” калектывы, якія рэгулярна даюць выступленні. Дарэчы, на “Славянскі базар” ад Рагачова паедзе танцавальны калектыў сучаснай харэаграфіі. Скончу тым, што ў нашай школе навучаецца вельмі таленавітая зорачка Беларусі па харэаграфіі, трынаццацігадовая Марыя Шашкова.

■ — У Юравіцкім манастыры, што ў Калінкавіцкім раёне, з 2007 года вядуцца рамонтныя работы. Але ў апошні час рэстаўрацыя актывізавалася. Што адбываецца ў манастыры і калі работы плануюць давесці да канца?

Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Аляксей Гардзіенка:

— Сапраўды ў старажытным манастыры, былым будынку калегіі іезуітаў, рамонт ідзе даволі даўно. Але з прыходам у вобласць новага губернатара Генадзя Салаўя работы набылі “новае дыханне”. Да 2023 года плануецца здаць аб’ект, гэта і фасадныя работы, якія будуць гатовы хутчэй, і ўнутраныя. Унутры ўжо ўзведзена сістэма будаўнічых лясоў, вядзецца тынкаванне і шпакляванне, каб у далейшым весці рэстаўрацыю насценных роспісаў.

■ — На дадзены момант менавіта Брэсцкая вобласць паказала найвышэйшы паказчык сярод астатніх рэгіёнаў па прышчэпваемасці ад каранавіруса сярод супрацоўнікаў культуры. Якім чынам гэта атрымалася?

Начальнік упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Сяргей Панасюк:

— Высокія вынікі па прышчэпваемасці атрыманы дзякуючы працы штаба намесніка старшыні аблвыканкама Сяргея Барысюка. Па даведзенаму заданню, мы толькі за мінулы тыдзень вакцыніравалі на 182 працэнты больш супрацоўнікаў культуры, чым у пазамінулы. Нашыя калегі разумеюць, што ў іх працы адбываецца найбольшая колькасць кантактаў з людзьмі, а таму робяць прышчэпкі збольшага ахвотна. Але мы і на асабістым прыкладзе паказваем патрэбнасць вакцынацыі — самі зрабілі яе.

Падрыхтаваў Павел САЛАЎЁЎ

Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры

За пошук, навацыі, выхаванне, падтрымку і развіццё чытання

Падведзены вынікі XXIX рэспубліканскага бібліятэчнага конкурсу

Сёння ў Беларусі сфарміравана бібліятэчная сістэма, якая ўключае больш за 7 тысяч публічных і спецыяльных бібліятэк з сукупным фондам каля 180 мільёнаў экзэмпляраў дакументаў.

Бібліятэчная сетка сістэмы Міністэрства культуры самая шматлікая: гэта 2475 дзяржаўных бібліятэк, у тым ліку Нацыянальная бібліятэка Беларусі і 6 абласных універсальных.

Удзел бібліятэк Рэспублікі Беларусь у захаванні і развіцці нацыянальнай культуры, у духоўна-маральным і патрыятычным выхаванні беларускага грамадства, фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў, укараненне інавацыйных тэхналогій, павышэнне якасці бібліятэчнай адукацыі, кадравае забеспячэнне з’яўляюцца прыярытэтнымі задачамі на сённяшні дзень і знаходзяцца ў полі зроку Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Бібліятэкі нашай краіны выконваюць місію захавання культурнай памяці народа і адыгрываюць значную ролю ў фарміраванні сістэмы каштоўнасцяў, традыцый і светапогляду, бо менавіта ў бібліятэчных фондах знаходзіцца багатая інтэлектуальная спадчына — важнейшы складнік духоўнага і матэрыяльнага багацця, культурнага і інфармацыйнага патэнцыялу нацыі.

Ва ўсе часы бібліятэчныя ўстановы былі і застаюцца бясплатнымі культурнымі цэнтрамі. Людзі чытаюць і наведваюць іх з задавальненнем, менавіта тут кожнага чакае шчасце сустрэчы з цікавай кнігай, або добрае мерапрыемства. У век камп’ютарных тэхналогій і інтэрнэту бібліятэкары працуць па-іншаму: больш папулярызуюць чытанне, кнігі, рэалізуюць новыя цікавыя праекты, шмат супрацоўнічаюць са школамі і дзіцячымі садкамі, выкарыстоўваюць новыя формы і метады бібліятэчнага абслугования і гэтак далей.

Ад імя Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і сябе асабіста выказваю глыбокую ўдзячнасць усім пераможцам і ўвогуле ўсім удзельнікам рэспубліканскага конкурсу “Бібліятэка-асяродак нацыянальнай культуры” за добрасумленную натхнёную творчую працу, выкананне конкурсных работ на высокім прафесійным узроўні, інавацыйны падыход за выкананне бібліятэчнай справы.

Алена БЕРАЗОЎСКАЯ,
галоўны спецыяліст упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

Працяг тэмы — на ст. 12 — 13.

Цэнтр умацоўваецца рэгіёнамі

6 ліпеня адбылася чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў Міністэрства. З дапамогай сродкаў відэасувязі, удзел у нарадзе прынялі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

На гэтай нарадзе аглядалі накірункі работы і праблемныя пытанні ўсіх абласцей краіны паасобку.

У Брэсцкай вобласці пільна рыхтуюцца да тэатральнага фэсту “Белая вежа”, ствараюць неабходныя ўмовы для годнай сустрэчы пэўных расійскіх і беларускіх труп. Міністр засяродзіў увагу прадстаўнікоў “Брэстрэстаўрацыі” на ліквідацыі ўсіх рамонтных праблем Брэсцкай абласной філармоніі ў бліжэйшай перспектыве. А ў горадзе Бяроза ідуць да лагічнага завяршэння ўсе раней намечаныя планы па стварэнню мемарыяла і абнаўленню экспазіцыі музея на месцы польскага канцэнтрацыйнага лагера, які быў тут у няпросты міжваенны перыяд.

У Магілёўскай вобласці на галоўным кантроле міністра — свята “Александрыя збірае сяброў”. Як далажылі Анатолію Маркевічу, усе квіткі на канцэрт прададзены. Адміністрацыя Магілёўскага аблвыканкама праз сучасныя сродкі відэасувязі таксама падзячыла Міністэрству культуры за выезд Купалаўскага тэатра ў Бабруйск 27 чэрвеня, дзе ўсе квіткі былі прададзены, што сведчыць пра вялікую цікавасць да абноўленай трупы і яе творчасці. А 17 ліпеня Магілёў прыме спартыўна-культурны фестываль “Вытокі”. З 6 па 12 верасня ў вобласці ўпершыню зладзяць фестываль лялечных тэатраў.

У Гомельскай вобласці чакаюць Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнку, які плануе здзейсніць рабочую паездку ў тым ліку ў аграгарадок Тіхінічы Рагачоўскага раёна, наведаць акрамя іншага і мясцовыя аб’екты культуры. Зараз у рэгіёне актыўна вядзецца рэстаўрацыя Юравіцкага манастыра, работы ідуць ужо ўнутры манастырскіх будынкаў. Далажылі Анатолію Маркевічу таксама аб якасна завершаным рамонце Добрушскага Дома культутры, дзе, дарэчы, у будучым годзе адсвяткуюць Дзень беларускага пісьменства.

У Гродзенскім рэгіёне адбудзецца канцэрт гурта “AURA” у абласной філармоніі. На асаблівым кантроле ў міністра — рамонт палацава-паркавага комплексу ў Свяцку. Таксама Анатолій Маркевіч пацікавіўся рэстаўрацыйнымі планамі, звязанымі з гісторыка-архітэктурнымі аб’ектамі ў Гальшанах, Крэва, Навагрудку, сродкі з бюджэту на якія былі выдзелены раней.

Дакладчык з Віцебскай вобласці падзячыў усім абласцям за калектывы, якія прыехалі на фестывалі вобласці “Браслаўскія зарніцы”, “Звіняць цымбалы і гармонік”.

У Мінскай вобласці рыхтуюцца адзначыць свята “Вытокі” ў Салігорске, правесці Фестываль хлеба ў Нясвіжы, таксама адсвяткаваць Дзень пісьменства ў Копылe. 21 ліпеня ў Любане плануецца абласная калегія. На кантролі міністра — якаснае абнаўленне Мемарыяльнага комплексу “Хатынь”, рамонт музея Янкі Купалы ў Вязынцы, а таксама фестываль “Каласавіны” на Сталбцоўшчыне.

Арамя гэтага кожная вобласць зрабіла справаздачу па вакцынацыі супрацоўнікаў культуры, прагучала тэма падрыхтоўкі да вераснёўскіх “Дажынак”, да новага навучальнага года.

Падрыхтаваў Павел САЛАЎЁЎ

Калектыў Беларускай дзяржаўнай філармоніі выказвае свае глыбокія спачуванні родным і блізкім у сувязі з заўчаснай смерцю былога дырэктара АНДРЭЕВА Ігара Сяргеевіча.

КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — КРЫВАНОС Аляксандр Паўлавіч; **адказны сакратар** — Таццяна ПАШЭНЬКА; **рэдактар аддзела:**
Яўген РАГІН; **агляддальнікі рэдакцыі:** Зміцер ЮРКЕВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Надзея КУДРЭЙКА, Антон РУДАК, Павел САЛАЎЁЎ, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльны карэспандэнт:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23.
Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова “КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА”.
Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
©“Культура”, 2021.
Наклад 2930. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 09.07.2021 у 18.30. Замова 1788.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства “Выдавецтва “Беларускі Дом друку”.
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

Страта

Гумілеўскі Леў Мікалаевіч

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні родным і блізкім народнага мастака Беларусі Льва Гумілеўскага. "Леў Мікалаевіч звязаў свой лёс з манументальным мастацтвам, стварыўшы шэраг помнікаў знакамітым беларускім дзеячам, і пакінуў незабыўны след у гісторыі нашай краіны", — гаворыцца ў спачуванні.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што творчасць Льва Гумілеўскага — бясцэнны ўклад у нацыянальную культурную скарбніцу. "Леў Мікалаевіч стаў прыкладам самаадданага служэння мастацтву і сваёй Радзіме. Светлая памяць аб ім назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах", — падкрэсліў Кіраўнік краіны.

Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА.

"Унутраная раўнавага" Льва Гумілеўскага —

пад такой назвай у "Культуры" быў апублікаваны артыкул заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Барыса Крэпака. Праз вытрымкі з яго мы згадаем некаторыя вехі творчага шляху народнага мастака Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі краіны, лаўрэата прэміі Саюзнай дзяржавы Льва Гумілеўскага.

Леў Гумілеўскі ўварваўся ў беларускую скульптуру імкліва, нястрымна і, здавалася, цалкам сфарміраваным творцам. БДТМІ ён скончыў у 1961 годзе, але праз кароткі час яго кампазіцыі, прысвечаныя беларускім партызанам, а таксама партрэты М.Багдановіча і С.Рахманінава паказалі, што іхні аўтар стаў у шэраг вядучых майстроў разца. А ў 42 гады Леў Мікалаевіч быў удастоены Дзяржаўнай прэміі БССР за помнік Янку Купалу ў Мінску (у сааўтарстве).

Ішоў час. І практычна кожны год Гумілеўскі "ўзрываў" мастацкую прастору сваімі арыгінальнымі і нязвыклымі творамі — як у галіне станковай, так і манументальнай пластыкі. Сярод іх — цудоўная алегарычная "Крылатая", "Экалогія" і "Чорная быль", "Ценям Тадэвуша Касцюшкі", "І толькі Бог вянчае нашы душы (А.Міцкевіч)", серыя кампазіцый, прысвечаная жыццю і смерці Янкі Купалы, цыкл вострых выразных партрэтаў дзеячаў беларускай гісторыі і культуры дня мінулага і дня сённяшняга, а таксама бронзавы рэльеф-трыпціх "Сказ аб Нясвіжы" бацькі і сына Гумілеўскіх у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі…

Мне здаецца, што скульптура жыве на ўласнай восі, як карціна ў раме. Аўтар можа адлюстроўваць моцны рух, але павінен памятаць, што яму патрэбна і "ўтрымаць"рэч, каб знайсці ўнутраную раўнавагу. І вось гэтая "ўнутраная раўнавага" — галоўная рыса большасці работ Гумілеўскага. Такая "класічнасць" пластыкі мыслення творцы — з'ява не выпадковая. Магчыма, яна зыходзіць з вопыту стасункаў з яго інстытуцкімі настаўнікамі Аляксеем Глебавым і Андрэем Бембелем, з калегамі па разцы Анатолем Анікейчыкам і Андрэем Заспіцкім, з уважлівага прыглядвання ў сусветную мастацкую класіку, з прыроднай інтуіцыі.

Дык вось, пра "ўнутраную раўнавагу". Што яна ўключае ў сябе ў творах мастака? Выразную рытміку ў актыўным прасторавым сілавым полі, узвышаны лірызм і яркую алегорыю, што цудоўна бачна, напрыклад, у помніках Янку Купалу ў Маскве або Францішку Багушэвічу ў Смаргоні (у сааўтарстве з Сяргеем Гумілеўскім). І што цікава: у адрозненне ад іншых тэндэнцый, якія імкнуцца ўзбагаціць магчымасці сучаснай скульптуры быццам знутры, Гумілеўскі зыходзіць як бы з супрацьлеглага, у многім адмаўляючы традыцыйныя прынцыпы.

Замест прастаты ён асмельваецца на складанасць, замест замкнёнай маналітнай тэктанічнасці прыўносіць разгорнутасць у прастору кампазіцыйнага рашэння, лінеярны механізм замяняе ажурнай экспрэсіяй...

У ягонай манеры лепкі немалаважную ролю адыгрывае жывапіснасць фактур. Гумілеўскі паэтызуе манументальнасць руху, пафас разняволенага ў прасторы палёту або таго ж палёту, толькі глыбока схаванага ўнутры. У гэтым ён — чалавек сённяшніх нястрымных рытмаў. Духоўная пераемнасць традыцыі праяўляецца ў майстра імкненнем да рамантычнага, заўсёды прыўзнятага над паўсядзённасцю вобраза. Дастаткова ўзгадаць яго вобразы М.Гусоўскага, К.Каліноўскага, А.Пушкіна, У.Караткевіча, М.К. Радзівіла (Сіроткі), М.Багдановіча. А яшчэ ён з натхненнем ляпіў актрыс А.Клімаву і А.Бендаву, мастака М.Савіцкага.

Ёсць у яго і дэкаратыўна-паркавая скульптура (у Нясвіжы, напрыклад), і "эксперыментальная" пластыка, што "набіраецца сіл" у майстэрні па вуліцы Арлоўскай.

Словам, творчасць Льва Гумілеўскага вельмі цікавая ў многіх адносінах. Яна прыцягвае і навізной вобразаў, і асаблівым ракурсам аўтарскага бачання, і пошукам складаных структур вобразаў-сімвалаў, у якіх нацыянальная гісторыя і сучаснасць адлюстроўваюцца ва ўсёй сваёй паэтычнай або драматычнай дынаміцы…"

■■■

Пайшоў з жыцця выдатны педагог і проста цудоўны, прыгожы чалавек. І цяпер ягоная велічная спадчына назаўсёды застанецца ў залатым фондзе нацыянальнага выяўленчага мастацтва.

"Культураўцы"

Калектыў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім Льва Мікалаевіча ГУМІЛЕЎСКАГА, вядомага беларускага скульптара, народнага мастака Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, сябра Беларускага саюза мастакоў, у сувязі з напаткаўшым іх вялікім горам.

Калектыў установы адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў" выказвае глыбокія спачуванні родным і блізкім у сувязі са смерцю выбітнага скульптара, народнага мастака Беларусі Льва Мікалаевіча ГУМІЛЕЎСКАГА.

Суайчыннікі

Радзіма — галоўная крыніца натхнення

Культура дапамагае фарміраваць давер адно да аднаго, а таксама ўсталёўвае і эканамічныя кантакты.

На пытанні "К" аб жыцці і актыўнасці нашых землякоў у Латвіі адказвае кіраўнік рыжскага беларускага таварыства "Прамень" і старшыня Саюза беларусаў Латвіі Алена ЛАЗАРАВА.

Ансамбль беларускай песні "Надзея".

— Некалькі слоў пра вашу супольнасць, яе гісторыю, колькасць удзельнікаў, самыя цікавыя праекты, рэалізаваныя вамі.

— У Латвіі пражывае каля шасцідзесяці пяці тысяч беларусаў, пераважная большасць з іх — у Рызе, Рыжскім раёне і ў Латгаліі — рэгіёне на памежжы з Беларуссю. Саюз беларусаў Латвіі быў створаны ў 2003 годзе і сёння ў яго ўваходзяць пятнаццаць таварыстваў, якія працуюць у розных гарадах Латвіі. Заснавальнікамі былі беларускія таварыствы Рыгі, Даўгаўпілса, Вентспілса і Ліепаі.

Дзякуючы дзейнасці Саюза і актывістам Рыжскага беларускага таварыства "Прамень", былі створаныя таварыствы ў Краславе, Лудзе, Елгаве, Рэзэкне, Екабпілсе. Далучыліся да нашага аб'яднання і два таварыствы славянскай культуры Прэйльскага краю "Вясёлка" і "Узоры". Былі створаныя беларускія таварыствы ў Вілянах, Дагдзе, Зілупэ і ў Елгаўскім краі. У 1994 годзе заснаваная Беларуская асноўная школа ў Рызе, якая з 2010 года носіць імя Янкі Купалы. У Даўгаўпілсе праводзіць заняткі з дзецьмі беларуская нядзельная школа "Вясёлка", у Рэзэкне і Екабпілсе працуюць беларускія класы. У Ліепаі ўжо пяць гадоў праводзіцца з моладдзю сумесны праект "Латвія — Беларусь: насустрач адно аднаму".

Ужо дваццаць сем гадоў выдаецца газета беларусаў Латвіі "Прамень", першы нумар якой выйшаў 12 снежня 1994 года. З 2015 года Даўгаўпілскае культурна-асветніцкае таварыства "Уздым" выдае аднайменную газету. Саюзам выдана шмат кніг, напрыклад, "Латвія — Беларусь: дыялог дзвюх культур", зборнік вершаў беларусаў, якія жывуць у Латвіі. Вялікай падзеяй стала выданне беларуска-латышскага і латышска-беларускага слоўніка, падрыхтаванага на аснове чарнавых матэрыялаў беларусісткі, доктара філалогіі Акадэміі навук Латвіі Мірдзы Абалы, выданне слоўніка прысвечана яе памяці. Хочацца таксама прыгадаць, што ў 2016 годзе Юлія Гарбанава абараніла доктарскую працу на тэму "Беларускія і латышскія кантакты ў першай палове XX стагоддзя і ў сучаснасці".

Адзін раз у месяц на Латвійскім Радыё-4 выходзіць перадача пра жыццё і дзейнасць беларусаў у Латвіі. Штогод выдаюцца зборнікі даследчых работ конкурсу "Беларусы Латвіі. Мінулае і сучаснасць". У 2015 годзе была выдадзеная брашура з матэрыяламі міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Роля нацыянальных меншасцяў у развіцці мультыкультурнай прасторы", якую рыхтаваў Саюз беларусаў Латвіі. Рэкамендацыі канферэнцыі былі разгледжаныя на пасяджэнні камісіі Сейма Латвіі пры абмеркаванні праграм далейшай інтэграцыйнай палітыкі. Зараз рыхтуецца да выдання кніга пра Саюз беларусаў Латвіі "З Айчынай у сэрцы". Будзем шчыра ўдзячныя Беларусі за магчымую падтрымку ў прафесійнай падрыхтоўцы кнігі і яе выданні.

Многія прадстаўнікі беларускай дыяспары Латвіі ўзнагароджаныя медалём Францыска Скарыны — Валянціна Піскунова, Мікалай Буры, Станіслаў Валодзька, Ганна Іване. Таксама прадстаўнікі беларускай дыяспары ў 2019 годзе былі ўзнагароджаны памятным медалём да 100-годдзя дыпламатычнай службы Беларусі.

Заканчэнне на ст. 11.

КУЛЬТУРА
WWW.KIMPRESS.BY
№ 28 / 10 ЛІПЕНЯ 2021 Г.

Скіраваная на рэалізацыю прыярытэтаў

Пра асноўныя мэты Праграмы “Культура Беларусі” мінулых і будучых гадоў

30 чэрвеня ў Міністэрстве культуры адбылася калегія па тэме “Вынікі рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі” ў 2016 — 2020 гадах і пра задачы на 2021 год”. З асноўным дакладам выступіла начальнік аддзела ўстаноў адукацыі Міністэрства Марына Юркевіч. З улікам таго, што выступоўца закранула досыць важныя і карысныя тэмы, сёння мы прапануем вытрымкі з яе даклада.

Марына Юркевіч.

Дзяржпраграма “Культура Беларусі” ўключала ў сябе 4 падпраграмы - “Спадчына”, “Мастацтва і творчасць”, “Архівы Беларусі”, “Беларусы ў свеце”, кожная з якіх мела сваю асноўную мэту. (...)

У перыяд рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы праведзена вялікая праца і сёння відавочныя важныя дасягненні ў сферы культуры.

Так, у рамках падпраграмы “Спадчына” ажыццяўляліся мерапрыемствы, накіраваныя на аснову гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь. У 2016 — 2020 гадах доля адрэстаўраваных і маючых адпаведнае функцыянальнае выкарыстанне помнікаў архітэктуры, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь, павялічылася з 15,0 працэнтаў у 2015 годзе да 33,7 працэнтаў у 2020 годзе (пры плане — 30,0 працэнтаў).

Праведзены рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы на аб’ектах, якія з’яўляюцца помнікамі гісторыі і культуры. Усяго за 2016 — 2020 гады адрэстаўраваны ці прыстасаваны пад новыя функцыі больш за 700 помнікаў архітэктуры.

Падрыхтаваныя 5 дасье на аб’екты спадчыны Рэспублікі Беларусь для ўключэння ў спісы UNESCO. У Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны UNESCO былі ўнесены тры новыя беларускія элементы: “Урачыстасць у гонар шанавання Іконы Маці Божай Будслаўскай”, “Вясновы абрад “Юр’еўскі карагод”; “Культура лясного бортніцтва”.

У параўнанні з 2015 годам аб’ём Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь павялічыўся на 6,8 працэнта. Важнымі падзеямі ў сферы музейнай дзейнасці сталі: адкрыццё Музея гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча, музея В.К. Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве, археалагічнага музея “Бярэсце”, музея “Выратаваныя мастацкія каштоўнасці”, літаратурнага музея Максіма Багдановіча і філіяла Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы “Акопы”; адкрыццё новых музейных экспазіцый у дзяржаўнай установе “Мемарыяльны комплекс “Брэсцкая крэпасць-герой”, у Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, рэалізацыя праекта “Мабільны музей” у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Калектывам дзяржаўнай установы “Нацыянальная бібліятэка Беларусі” рэалізавана некалькі маштабных праектаў. У 2017 годзе ў рамках святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ажыццёўлены міжнародны навуковы і выдавецкі праект “Кніжнае спадчына Францыска Скарыны”.

У выніку рэалізацыі мерапрыемстваў падпраграмы “Мастацтва і творчасць” у 2016 — 2020 гадах у сферы прафесійнага мастацтва праведзена больш за 79,5 тысяч культурных мерапрыемстваў, адбылося каля 800 прэм’ерных паказаў. Каля 3 мільёнаў рознагпланавых культурных мерапрыемстваў праведзена клубнымі арганізацыямі.

Штогод Міністэрствам культуры праводзілася больш за 60 спецыяльных культурных мерапрыемстваў (у 2020 годзе — больш за 40), у тым ліку прысвечаных важным дзяржаўным падзеям, з удзелам вышэйшых службовых асоб дзяржавы, фестывалі, конкурсы, Дні культуры. Сярод іх урачыстая цырымонія ўручэння прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае адраджэнне”, спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “Беларускі спартыўны Алімп”, мерапрыемствы да Дня Перамогі, Дня Незалежнасці і іншыя.

Штогод праводзілася больш за 300 персанальных выстаў беларускіх мастакоў.

Гастролі беларускіх прафесійных калектываў мастацкай творчасці адбыліся ў розных краінах (Аўстрыі, Вялікабрытаніі, Венгрыі, Германіі, Грузіі, Даніі, Ірландыі, Казахстане, КНР, Ліване, Люксембургу, Мексіцы, Нарвегіі, Аб’яднаных Арабскіх Эміратах, Польшчы, Партугаліі, Расіі, Францыі, Чэхіі).

Упершыню ў 2018 годзе адбыўся рэспубліканскі конкурс “Нацыянальная кінапрэмія Беларусі”. Завяршылася рэканструкцыя і рамонт комплексу будынкаў кінастудыі “Беларусьфільм”.

На рэгулярнай аснове былі праведзены буйныя міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі мастацтваў. Адбыліся 28 Дзён культуры і Дзён нацыянальнага кіно ў замежных краінах з прэзентацыяй лепшых дасягненняў нацыянальнай культуры, а таксама Дзён культуры замежных краін у Беларусі.

У рамках мерапрыемстваў падпраграмы “Архівы Беларусі” (...) праведзены работы па пашырэнні плошчаў для захоўвання архіўных дакументаў у дзяржаўных архіўных установах. Агульная плошча архівасховішч пашырылася больш чым на 1831 квадратных метраў.

За перыяд рэалізацыі падпраграмы выдадзены 6 архіўных даведнікаў. Павялічыўся лічбавы кантэнт архіўных дакументаў. Забяспечвалася вядзенне шматузроўневай інфармацыйна-пошукавай Сістэмы адкрытага доступу да дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь.

У рамках падпраграмы “Беларусы ў свеце” праведзены 3 пасяджэнні Кансультатыўнага савета пры Міністэрстве замежных спраў па пытаннях беларусаў замежжа, у тым ліку яго беларускай часткі; больш за 330 мерапрыемстваў прайшло з удзелам беларускіх прафесійных і аматарскіх калектываў мастацкай творчасці, якія праводзяцца беларусамі замежжа; адбыўся трэці фестываль мастацтваў беларусаў свету, у якім прынялі ўдзел больш за 300 беларусаў замежжа з 19 краін свету.

У 2018 — 2020 гадах прыярытэтнай задачай удасканалення матэрыяльна-тэхнічнай базы арганізацый культуры было абнаўленне (папаўненне і рамонт) фонду музычных інструментаў устаноў культуры і адукацыі ў сферы культуры. У мэтах выканання даручэння Кіраўніка дзяржавы набыты і перададзеныя ва ўстановы культуры і ўстановы адукацыі ў сферы культуры 1460 піяніна, у тым ліку ў арганізацыі сістэмы Міністэрства культуры — 1228 адзінак, у арганізацыі сістэмы Міністэрства адукацыі — 232 адзінкі. (...)

У 2016 — 2020 гады адзначаецца паскарэнне тэмпаў інфарматызацыі сферы культуры. На базе праграмна-тэхнічных сродкаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі створаны лічбавыя калекцыі і зводны электронны каталог бібліятэк Беларусі, у якім у цяперашні час налічваецца каля 5 мільёнаў запісаў.

У 2018 годзе завершана мадэрнізацыя Дзяржаўнага каталога Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь.

Усе ўстановы вышэйшай адукацыі ў сферы культуры, дзяржаўныя стацыянарныя кінатэатры маюць выхад у Інтэрнэт.

У цэлым агульны вынік выглядае добра. Аднак выкананне мерапрыемстваў і дасягненне зводных мэтавых паказчыкаў было абцяжарана (асабліва ў 2020 годзе) шэрагам знешніх для сферы культуры аб’ектыўных фактараў.

Асноўнымі фактарамі з’явілася недастатковае фінансаванне некаторых мерапрыемстваў, а таксама неабходнасць выканання рэкамендацый Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь па абмежаванні правядзення масавых мерапрыемстваў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй.

У выніку не ўдалося выканаць усе мерапрыемствы Дзяржпраграмы ў поўным аб’ёме і ў сувязі з гэтым дасягнуць запланаваных значэнняў усіх зводных мэтавых паказчыкаў.

На рэалізацыю Дзяржпраграмы з розных крыніц былі вылучаныя 3 мільярды 133 мільёнаў 800 тысяч рублёў. Працэнт асваення сумы склаў 97,4 прыцэнты. (...)

Большасць нявыкананых у поўным аб’ёме мерапрыемстваў Дзяржпраграмы ўвайшлі ў Дзяржаўную праграму “Культура Беларусі” на 2021 — 2025 гады.

Па выніках рэалізацыі Дзяржпраграмы за перыяд 2016 — 2020 гады выкананыя 3 зводных мэтавых паказчыка, не выкананы 2. У падпраграме “Спадчына” з 6 мэтавых паказчыкаў не дасягнута планавае значэнне 2 паказчыкаў. У падпраграме “Мастацтва і творчасць” з 7 мэтавых паказчыкаў не дасягнута значэнне 1 паказчыка. У падпраграме “Беларусы ў свеце” з 3-х мэтавых паказчыкаў за ўвесь перыяд рэалізацыі падпраграмы не выкананы 2. У падпраграме “Архівы Беларусі” ўсімі заказчыкамі дасягнута планавае значэнне 3-х мэтавых паказчыкаў.

Улічваючы асаблівыя складаныя сацыяльна-эканамічныя ўмовы, якія склаліся ў 2020 годзе, было прынята ўзгодненае з Міністэрствам эканомікі Рэспублікі Беларусь рашэнне пры адзнацы ступені дасягнення мэтавых паказчыкаў Дзяржпраграмы, значэнні якіх наўпрост звязаныя з культурнай актыўнасцю насельніцтва, узяць за аснову значэнні паказчыкаў па выніках 2019 года. Прымаючы пад увагу, што зводны мэтавы паказчык “Прырост колькасці наведванняў арганізацый культуры” (да ўзроўню 2015 года) і мэтавы паказчык “Прырост колькасці наведванняў музеяў” (да ўзроўню 2015 года) не выкананы ў 2020 годзе па аб’ектыўных прычынах.

5 мая 2021 года адбылося пасяджэнне пастаяннай міжведамаснай камісіі па дзяржаўных праграмах, на якім разглядаліся вынікі рэалізацыі Дзяржпраграмы “Культура Беларусі” на 2016 — 2020 гады. З улікам уплыву эпідэміялагічнай сітуацыі, а таксама дынамікі рэалізацыі Дзяржпраграмы за ўвесь перыяд, пастаянная міжведамасная камісія прызнала рэалізацыю Дзяржпраграмы як эфектыўную. Эфектыўнасць рэалізацыі падпраграм “Спадчына”, “Мастацтва і творчасць”, “Архівы Беларусі” прызнаная высокаэфектыўнай, падпраграмы “Беларусы ў свеце” —- сярэднеэфектыўнай.

Дзяржпраграма, прынятая ў студзені 2021 года, накіравана на рэалізацыю прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021 — 2025 гады і рашэнне задач дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры.

Пастаўлена адзіная мэта Дзяржаўнай праграмы — стварэнне ўмоў для эфектыўнага функцыянавання сеткі арганізацый культуры і актыўнага ўключэння грамадзян Беларусі ў культурнае жыццё краіны.

Дзяржаўная праграма ўключае ўжо пяць падпраграм — “Культурная спадчына” накіравана на захаванне культурнай спадчыны; забеспячэнне даступнасці, якасці і разнастайнасці паслуг, якія прадстаўляюцца бібліятэкамі і музеямі, выставачнымі арганізацыямі, паркамі культуры і адпачынку, заапаркамі; падтрымка развіцця культур нацыянальных меншасцяў. “Мастацтва і творчасць” па якой праводзіцца падтрымка развіцця прафесійнага мастацтва, садзейнічанне павышэнню яго мастацкага ўзроўню, разнастайнасці і даступнасці для насельніцтва, развіццё міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы мастацтва і творчасці; падтрымка развіцця кінематаграфічнай дзейнасці; забеспячэнне даступнасці, якасці і разнастайнасці паслуг, якія прадстаўляюцца клубнымі арганізацыямі і арганізацыямі культуры змешанага тыпу. “Функцыянаванне і інфраструктура сферы культуры” ўключае меры, якія забяспечваюць выкананне наступных задач: удасканаленне інфраструктуры сферы культуры і забеспячэнне дзейнасці апарату Міністэрства культуры; інфарматызацыя і стварэнне нацыянальнага лічбавага кантэнту ў сферы культуры. Мерапрыемствы падпраграмы “Беларусы ў свеце” разлічана на вырашэнне задачы па развіццю партнёрства паміж дзяржавай і беларусамі замежжа. “Архівы Беларусі” — накіраваная на рашэнне задачы па забеспячэнню фарміравання, захаванасці і выкарыстання дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь як часткі інфармацыйнага рэсурсу краіны.

Для адзнакі дасягнення мэты выкарыстоўваецца 1 зводны мэтавы паказчык “Колькасць наведванняў арганізацый культуры на 1000 чалавек насельніцтва”.

Рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы будзе садзейнічаць дасягненню на нацыянальным узроўні Мэтаў устойлівага развіцця на перыяд да 2030 года.

У завяршэнне — на перспектыву можна зрабіць асноўныя высновы, звязаныя з аналізам вынікаў рэалізацыі Дзяржпраграмы.

Пандэмія COVID-19 істотна паўплывала на культурнае жыццё ў краіне: прыпынілі сваю працу кінатэатры, канцэртныя залы, значна зменшылася колькасць мерапрыемстваў і наведвальнікаў традыцыйных арганізацый культуры. З іншага боку, адбыўся росквіт анлайн-тэхналогій у галіне культуры, з’явіліся новыя анлайн-прадукты, спажываныя праз сетку Інтэрнэт, павялічылася колькасць зваротаў да лічбавых рэсурсаў культуры. Наступствы будуць аказваць моцны ўплыў на жыццё людзей на працягу яшчэ некаторага часу. Мы павінны ўлічыць гэтыя тэндэнцыі і актывізаваць работу па цыфравізацыі сферы культуры.

Таму у прынятай Дзяржаўнай праграме “Культура Беларусі” на 2021 — 2025 гады прадугледжана падпраграма “Функцыянаванне і інфраструктура сферы культуры”, у якой запланаваны мерапрыемствы па рашэнні задачы інфарматызацыі і стварэння нацыянальнага лічбавага кантэнту ў сферы культуры.

Аналіз выканання мерапрыемстваў Дзяржпраграмы паказаў, што асноўнай прычынай невыканання альбо частковага выканання асобных мерапрыемстваў (у аргументацыі заказчыкаў) з’яўляецца недафінансаванне, альбо адсутнасць фінансавання. (...)

У сувязі з гэтым пры рэалізацыі Дзяржпраграмы 2021 — 2025 неабходна прымаць вычарпальныя меры па недапушчэнні недафінансавання мерапрыемстваў, а таксама пераразмеркавання фінансавых сродкаў на іншыя мэты, не прадугледжаныя Дзяржпраграмай 2021 — 2025. (...)

Адзначу, што ў цэлым з улікам сітуацыі, якая склалася ў краіне і ў свеце, рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі” на 2016 — 2020 гады завяршылася паспяхова і цалкам адпавядала прыярытэту Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016 — 2020 гады — развіццю чалавечага патэнцыялу і павышэнню якасці жыцця беларускага народа.

К

Вырашана!

Пасля вайны тут жылі людзі (буд. 1917 года).

Сядзіба. Вясна. 2021 год. (*фота з Сеціва*)

Каменны крыж.

Сядзіба Цюндзявіцкіх у Галошава пад аховай дзяржавы

З вясны 2019 года рэдакцыя нашай газеты з трывожнай зацікаўленасцю сачыла за лёсам сядзібы, якая атрымала асабістае імя "Беларускі Манчэстэр". Мы рабілі гэта не проста ў задуменні прыклаўшы далонь да ілба, а маніторылі стан сядзібы падчас выездаў на аб'ект. І ў межах сваіх магчымасцяў прыкладалі пэўныя намаганні для захавання гэтага ўнікальнага для нашай краіны аб'екта (гл. "К" — №№ 16, 2019 і 13,24, 2021).
Сёння ў нас для нашых чытачоў, нарэшце, добрая навіна. 23 чэрвеня 2021 года сядзіба афіцыйна ўзята пад ахову дзяржавы. Праўда, пакуль яшчэ мы не будзем спяшацца пераносіць адсюль святло нашага "Культура"ўскага пражэктара на іншыя аб'екты. Галошава застанецца пад нашай апекай і надалей.

Зміцер ЮРКЕВІЧ

Калі была школа... (*здымак Вітальда Ханецкага*)

Альтанка з лістоўніц і корпус 1914 года.

Тэраса. Вясна. 2019 год.

Тэраса. Снежань. 2021 год.

УВОДЗІНЫ

Гісторыя гэтых мясцін даўняя і цікавая. Калісьці тут жылі крывічы, ад якіх да нашага часу засталіся курганы і велізарны каменны крыж на беразе возера. Пазней тут атабарыўся род князёў Друцкіх. А ў XIX стагоддзі ад гаспадароў Лускінаў маёнтак перайшоў да Цюндзявіцкіх. Менавіта дзякуючы ім аграмаёнтак пераўтварыўся ў моцны прамысловы вузел і атрымаў назву "Беларускага Манчэстэра", які нават згадвалі ў СМІ напачатку XX стагоддзя. Дарэчы, ведаў гаспадароў маёнтка і, магчыма, бываў у Галошава вядомы філамат, паэт і геолаг Тамаш Зан (жыў у адносна недалёкім Какоўчына, пахаваны ў Смалянах, — вось і турыстычны маршрут). Пасля вайны ў Галошава была школа, а калі школу закрылі, у сядзібу прыйшлі абыякавыя людзі альбо вандалы. Яны, на жаль, доўга не пакідалі сядзібу "без увагі", нягледзячы на розгалас, узняты ў СМІ. Гэта вынікае з фотаздымка, зробленага вясной, на якім бачна, што з левага крыла будынка 1897 года пабудовы цалкам (!) знік дах. Хаця зімой частка даха (з кроквамі і шыферам) яшчэ была. А вясной 2019 года, за месяц да нашага першага візіту, чатыры цагляныя калоны параднага ганку былі знесены гаспадарчай групай Талачынскага райвыканкама. Без асаблівай на тое прычыны (калоны былі ў ідэальным стане). Ну, калон ужо не вярнуць. Трэба захаваць, што засталося. А засталося нямала.

РАШЭННЕ

Вестка аб тым, што пытанне аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці вырашана станоўча, маланкай абляцела Беларусь каля тыдня таму. Але перад тым як паведаміць важную навіну, мы вырашылі пачакаць афіцыйнага пацвярджэння. Цяпер мы можам спаслацца на дакумент, якім з намі падзяліўся старшыня ГА "Беларускае дабраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры" спадар Антон Астаповіч:

"Рашэнне Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ад 23 чэрвеня 2021 г. № 328 Аб наданні статусу і катэгорыі гісторыка-культурнай каштоўнасці.

...

2. надаць нерухомай матэрыяльнай каштоўнасці "Сядзібна-паркавы комплекс Цюндзявіцкіх: ***рэшткі сядзібнага дома, рэшткі флігеля*** *і дзвюх* ***гаспадарчых пабудоў, фрагменты парку****" (датаванне каштоўнасці — канец XIX ст.), размешчанай ў Талачынскім раёне ў в. Галошава на вул. Школьнай, статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыю "3".*

3. Талачынскіму раённаму выканаўчаму камітэту ў месячны тэрмін:

3.1. арганізаваць падпісанне ахоўных абавязацельстваў;

3.2.забяспечыць падрыхтоўку пашпартоў на дадзеныя гісторыка-культурныя каштоўнасці.

4. Кантроль за выкананнем гэтага рашэння ўскласці на начальніка ўпраўлення культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта".

У законе Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" маецца такое азначэнне катэгорыі "3" — "*гісторыка-культурныя каштоўнасці, адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці якіх маюць значнасць для асобных рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь*". Бясспрэчна, Галошава ўсім гэтым вартасцям адпавядае і значнасць мае.

Апрача сядзібна-паркавага комплексу Галошава згодна з тым жа рашэннем статус помніка "3" катэгорыі атрымаў "Помнік Я.П. Кульнёву", размешчаны ў Полацкім раёне, на левым беразе ракі Дрыса на месцы былой Сівошынскай пераправы. Якаў Кульнёў быў генерал-маёрам расійскага войска. Загінуў на гэтым месцы ў 1812 годзе. У 1834 годзе быў перапахаваны ў маёнтку яго брата (сёння Латвія).

ШТО ДАЛЕЙ?

Думаем, што без чарговага выезда на аб'ект "К" не абыйсціся. Хацелася б пачуць адносна гэтага рашэння меркаванні мясцовых жыхароў, якіх, на вялікі жаль, у вёсцы засталося не так і шмат. Трэба ж было б і паразмаўляць адносна лёсу гісторыка-культурнай каштоўнасці "3 катэгорыі" з прадстаўнікамі мясцовай адміністрацыі ў Галошава, ля сцен сядзібы, якая сёлета мусіла пераўтварыцца ў гару будаўнічага смецця (гл. "К" № 13 , 2021).

Магчыма, мы заспеем у Галошава якую-небудзь талаку энтузіястаў, да якой з ахвотай далучымся. Бо, як вынікае з публікацый у сацыяльных сетках, ёсць шмат грамадзян нашай краіны, якім Галошава не абыякава. Бывае там і немалая колькасць турыстаў, асабліва ў апошні час, калі імя сядзібы пастаянна на слыху. І колькасць іх будзе толькі павялічвацца. Таму, адначасова з распрацоўкай пашпартоў аб'екта, хацелася б, каб мясцовая адміністрацыя падумала пра інфармацыйныя стэнды з гісторыяй Галошава. Як гэта робіцца там, дзе да сваёй спадчыны ставяцца з павагай.

К

З пажаданнем удачы на віцебскай сцэне!

Міжнародны фестываль мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску” распачнецца 14 ліпеня — сёлета ён будзе юбілейным, 30-м па ліку. Традыцыйна ў яго межах пройдуць дарослы і дзіцячы конкурсы выканаўцаў эстраднай песні. Са сваімі прадстаўнікамі ў конкурсе Беларусь вызначылася яшчэ ў сакавіку, калі ў Барысаве пройшоў фінал нацыянальнага адборачнага тура. Такім чынам, сёлета нашу краіну ў песенных спаборніцтвах “Славянскага базару ў Віцебску — 2021” будуць прадстаўляць двое мінчан: 20-гадовы Данііл Мышкавец і 13-гадовы Канстанцін Мазуркевіч, абодва ў фінале нацыянальнага адбору выступілі пераканаўча і перамаглі іншых канкурсантаў упэўнена. З гэтымі маладымі артыстамі, якіх пакуль не назавеш вядомымі, мы зараз і пазнаёмімся. Удзел у “Славянскім базары ў Віцебску” — сапраўдны шанс праславіцца.

Надзея КУДРЭЙКА

За апошнія гады мы пачалі прызвычайвацца да высокіх месцаў і нават перамог беларусаў у песенных конкурсах віцебскага фестывалю. Летась у дарослым конкурсе выканаўцаў эстраднай песні перамог Раман Волазнеў, а ў Дзіцячым міжнародным конкурсе беларускія артысты перамагалі і летась — Ангеліна Ламака, і пазалетась — Ксенія Галецкая, і ў 2017-м перамагла беларуска — Марыя Магільная. Мяркуючы па выступленнях Даніила Мышкаўца і Канстанціна Мазуркевіча ў фінале беларускага адбору ў Барысаве, і сёлета за беларускіх канкурсантаў як мінімум не будзе сорамна.

■ Даніил Мышкавец, прадстаўнік Беларусі ў Міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні “Віцебск-2021”.

На мінулым тыдні таму Даніил Мышкавец атрымаў дыплом аб заканчэнні Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў, і цяпер ён дыпламаваны “Артыст. Кіраўнік эстраднага калектыву. Настаўнік”. Пра гэтую навучальную ўстанову Даніил гаворыць толькі ў захопленых словах і дзякуе лёсу, што навучаўся тут. Асабліва дзякуе свайму педагогу па вакале, выкладчыку каледжа Дзянісу Лісу, менавіта з ім ён і рыхтуецца да конкурсу. У каледжы мастацтваў музычная падрыхтоўка рознабаковая, і шмат увагі аддаецца джазавай музыцы, што для Даніила Мышкаўца як для вакаліста вельмі важна. Адметны факт, што леташні ўладальнік Гран-пры “Славянскага базару ў Віцебску” Раман Волазнеў таксама заканчваў гэты ж самы Мінскі каледж мастацтваў і таксама з удзячнасцю адзначаў навучанне ў ім. Зараз Раман вельмі паспяховы музыкант, саўндпрадзюсар, працуе ў Маскве, яго песні і музыку выконваюць многія вядомыя артысты.

Праўда, калі прадоўжыць параўнанне Рамана Волазнева і Даніила Мышкаўца, то трэба зазначыць, што Даніилу не ўсё давалася так проста і хутка. І ў каледж ён паступіў не з першага разу, і ў адборы на “Славянскі базар у Віцебску” раней ужо меў не вельмі ўдалы вопыт. Ды што й казаць: сёлета ў сакавіку Даніил перамог на нацыянальным адборы да віцебскага фестывалю, а на пачатку чэрвеня ўдзельнічаў як канкурсант у Нацыянальным фестывалі беларускай песні і паэзіі “Маладзечна” — і не тое што не перамог, а і ўвогуле не заняў ніякага месца! Праўда, да такога “здарэння” малады артыст паставіўся з гумарам, і яно ніяк не паўплывала на яго настрой перад конкурсам “Славянскага базару ў Віцебску”.

Свае конкурсныя песні Даніил Мышкавец не мяняў, на сцэне віцебскага амфітэатра прагучаць тыя ж самыя творы, што і ў фінале нацыянальнага адбору ў Барысаве. За іх выкананне былі атрыманы вельмі высокія адзнакі, і адрыў ад артысткі, што заняла другое месца, быў значны: у сэнсе, не было падстаў шукаць нешта іншае. Адзінае што, цяпер “Славянскі хіт” давядзецца спяваць не пад “мінус адзін”, а ў суправаджэнні аркестра — і гэта будзе Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам Віталя Кульбакова. Для сябе 20-гадовы артыст абраў чамусьці вельмі даўнюю і не вельмі вядомую беларускую эстрадную песню — бо шукаў менавіта не сярод сучаснай музыкі, а з так званай песеннай класікі — “Я магу купіць каханне” кампазітара Леаніда Захлеўнага на словы паэта Леаніда Пранчака. Даніил кажа, што любіць песні са зместам, да таго ж гэтая кампазіцыя сваёй мелодыкай і драматызмам вельмі падыходзіць для вакальных конкурсаў. А спяваць з аркестрам Даніілу даводзілася ўжо неаднойчы, у тым ліку і з гэтым самым Прэзідэнцкім аркестрам Рэспублікі Беларусь. Сусветны хіт — таксама меладычная, прыгожая і запамінальная балада групы Scorpions “Maybe I, Maybe You”. На мой погляд, маладому спеваку яна ўдаецца значна лепей — атрымліваецца паказаць не толькі вакальнае майстэрства, але і эмоцыі, у ёй ён пачувае сябе больш гарманічна.

Як кажа кампазітар Алена Атрашкевіч — старшыня камісіі “Мастацтва эстрады (спевы)” Мінскага каледжа мастацтваў, для кагосьці Даніил Мышкавец можа падацца “тёмной лошадкой”, але ў каледжы добра ведаюць яго талент, працаздольнасць і адказнасць. Акрамя таго, у яго добры густ і ён умее змагацца, таму ўсе шансы на перамогу мае.

Дыплом Даніил атрымаў толькі зараз, але ж педагогам па вакале працуе ўжо амаль чатыры гады, — практычна столькі ж, колькі навучаўся ў каледжы: ён вучыць спяваць дзяцей, і, кажуць, у яго гэта атрымліваецца. Хоць сваіх уласных песень, якія гучалі б у эфірах на радыё, яшчэ не запісваў, але ж вопыт выступленняў і нават здымак у тэлеперадачах — “Наперад у мінулае”, “Макаёнка, 4”, “Сыграй мяне, калі зможаш” — ужо ёсць. Увогуле, Даніил кажа, што тэлебачанне яго моцна вабіць і ён хацеў бы там працаваць — і рэпарцёрам, і стваральнікам праграм. Хацеў бы паступіць і ва Універсітэт культуры на спецыяльнасць “Менеджмент сацыякультурнай сферы”. Прызнаецца, што гэтак жа, як пакуль шукае свой стыль у музыцы, так і па-за ёй яшчэ не вызначыўся з прыярытэтамі. А у свой час ён іграў і ў КВН, і спяваў у фальклорным ансамблі “Неруш”. Зараз мае свой бэнд, у якім з іншымі маладымі музыкантамі выконвае аўтарскую музыку, але гэта таксама яшчэ спробы і пошукі свайго месца ў музыцы.

Конкурс “Славянскага базару ў Віцебску” для Даніила пакуль самы вялікі і прэстыжны, рыхтуецца да яго артыст вельмі адказна. Праўда, прайшоўшы раней праз шматлікія спаборніцтвы, заўважае, што гэта ўсё ж не ягоная стыхія: яму падабаецца проста выступаць. Але “Славянскі базар у Віцебску” — крыху іншая справа. Даніил якраз з тых людзей, хто з года ў год сочыць за гэтым фестывалем, хто глядзіць конкурсныя канцэрты, хто, мабыць, даўно ўжо ўяўляў сябе на гэтай сцэне, і вось мара юнака неўзабаве здзейсніцца.

Дарэчы, у падрыхтоўцы да выступлення нашы маладыя артысты не засталіся самнасам: і Даніил Мышкавец, і Канстанцін Мазуркевіч вельмі ўдзячныя Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь, якое вырашала пытанні і прадастаўляла ўсё патрэбнае: і належных педагогаў забяспечвала, і харэографаў, каб у міжнародным спаборніцтве беларускія канкурсанты змаглі паказаць сябе найлепшым чынам.

■ Канстанцін Мазуркевіч, прадстаўнік Беларусі ў Міжнародным дзіцячым музычным конкурсе “Віцебск-2021”.

Мінчанін Канстанцін Мазуркевіч ужо увайшоў у гісторыю нацыянальных адбораў да дзіцячага конкурсу “Славянскага базару у Віцебску”. Калі ў Барысаве ён выканаў сваю першую песню — “Падзяка сэрца” з рэпертуару Uzari — гэта было настолькі пераканаўча і нават бліскуча, што журы паставіла яму ўсе дзясяткі! Я думаю, ужо тады было зразумела — хоць наперадзе было яшчэ і выкананне другой песні, і спевы амаль усіх астатніх канкурсантаў, што ў Віцебск паедзе менавіта Канстанцін.

Зараз яму 13 гадоў, у музыцы ён далёка не пачатковец — вучыцца ёй у мінскай гімназіі № 192. Іграе на фартэпіяна, а вось вакалам ушчыльную пачаў займацца толькі тры гады таму: аказалася, што ў яго добра атрымліваецца спяваць. Да таго ж у Канстанціна і адпаведная сцэнічная знешнасць, і на сцэне ён пачувае сябе ўпэўнена. Гэтыя тры гады ў школе вакалу “Мікс” з ім працуе педагог Марыя Абасава, якая акрамя навучання дапамагала рыхтавацца да ўсіх конкурсаў, уключна са “Славянскім базарам у Віцебску”. Марыя Абасава лічыць, што ў яе вучня вялікі талент, а акрамя таго — ён сапраўдная асоба.

Хоць і не так даўно юнак пачаў спяваць, але ўжо можа пахваліцца шэрагам перамог у розных конкурсах. З узроўнем віцебскага, канешне, яны параўнацца не могуць. Увогуле, і ў адборы да “Славянскага базару ў Віцебску” Канстанцін Мазуркевіч раней не ўдзельнічаў, ды й не вельмі цікавіўся фестывалем, для яго гэта новая тэма. Праўда, год таму яна стала вельмі блізкай і актуальнай, калі Гран-пры ў Дзіцячым міжнародным конкурсе “Віцебск-2020” узяла Ангеліна Ламака, навучэнка той жа гімназіі № 192, дзе вучыцца і Канстанцін. Можна ўявіць, як бы гімназія хацела, каб яе навучэнец другі год запар узяў Гран-пры конкурсу!

У Віцебску прагучыць ізноў жа “Падзяка сэрца” — за дазвол яе выкарыстаць і за фанаграму Канстанцін Мазуркевіч шчыра дзякуе Юрыю Наўроцкаму, які вядомы пад псеўданімам Uzari. А вось назву другой песні — а гэта будзе іншая кампазіцыя, не тая, што гучала на адборы ў Барысаве і якая ў юнага артыста атрымалася крыху горш за першую — вырашана да самога конкурсу не адкрываць. Вядома толькі, што кампазіцыя будзе на англійскай мове.

Як бы ні склалася гісторыя з конкурсам “Славянскага базару ў Віцебску”, Канстанцін Мазуркевіч плануе звязаць сваё жыццё менавіта з музыкай. Хоць у 13-гадовым узросце ў яго наперадзе яшчэ шмат часу для выбару, але зараз ён кажа, што хоча паступаць вучыцца на джазавую музыку.

XIX Міжнародны дзіцячы музычны конкурс “Віцебск-2021” пройдзе на сцэне канцэртнай залы “Віцебск” 17 і 18 ліпеня, пачатак канцэртаў а 15-й гадзіне. XXX Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні “Віцебск-2021” пройдзе на сцэне Летняга амфітэатра: 17 ліпеня канкурсанты выканаюць “Сусветны хіт”, разам з імі будзе выступаць балет Алы Духавай “Todes”. А вось другі тур з выкананнем “Славянскага хіта” ў суправаджэнні Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам Віталя Кульбакова пройдзе 18 ліпеня ў межах канцэрта-закрыцця фестывалю “Славянскі базар у Віцебску — 2021”. Традыцыйна, конкурсныя канцэрты можна будзе ўбачыць у прамой тэлетрансляцыі, што зладзіць Белтэлерадыёкампанія.

К

Фота з уласных архіваў артыстаў.

Адкрыты фармат дысертацыі

Пра навуковыя здабыткі і іміджавыя праекты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў — гэта, як вядома, не толькі ўстанова адукацыі, але і буйны навуковы цэнтр, дзе ажыццяўляецца навукова-даследчая праца, арганізуюцца міжнародныя, рэспубліканскія навуковыя і навукова-практычныя канферэнцыі, у тым ліку і студэнцкія, умацоўваюцца і развіваюцца навуковыя сувязі паміж айчыннымі і замежнымі даследчыкамі ў сферы культуры і мастацтва. Пра навуковы аспект працы БДУКМ, супрацоўніцтва з рэгіёнамі, міжнароднае супрацоўніцтва ды многае іншае "К" пагутарыла з прарэктарам па навуковай рабоце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Аленай КОРСАКАВАЙ.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ /Фота аўтара і з сайта БДУКМ

Алена Корсакава.

Музейная экспазіцыя ў БДУКМ.

— Алена Яўгенаўна, ці паўплывала на навуковую дзейнасць БДУКМ сённяшняя неспрыяльная эпідэміялагічная сітуацыя? Як змаглі адаптаваць сваю працу, скажам, пры правядзенні навуковых канферэнцый?

— Як ні дзіўна, пандэмія некаторым чынам спрыяла развіццю навуковай дзейнасці. Пераход канферэнцый у рэжым анлайн спрыяў павелічэнню іх колькасці. Якраз з нядаўняга часу мы пашырылі спектр нашых навуковых і навукова-практычных канферэнцый: раней ладзілі пяць, цяпер — сем. Натуральна, з-за неспрыяльнай эпідэміялагічнай сітуацыі давялося новыя канферэнцыі ладзіць у завочным фармаце. Так, у канцы красавіка ў нас адбылася міжнародная завочная навуковая канферэнцыя "Барышаўскія чытанні", а літаральна днямі, 24 чэрвеня, прайшла яшчэ адна міжнародная завочная канферэнцыя "Культура: адкрыты фармат". На апошняй, дарэчы, прысутнічалі прыкладна 85 удзельнікаў як з Беларусі, так і з Кітая, Украіны, Расіі.

— А ці ўдзельнічаюць у падобных навуковых канферэнцыях спецыялісты з рэгіёнаў? І, калі ўдзельнічаюць, то хто менавіта?

— Так, на згаданай мной канферэнцыі "Культура: адкрыты фармат" былі прадстаўнікі рэгіянальнай сферы культуры з Віцебска, Магілёва, Мазыра, Лунінца, іншых гарадоў. Пераважна гэта нашы былыя студэнты, магістранты, аспіранты, якія цяпер працуюць ва ўстановах культуры розных раёнаў Беларусі, і, натуральна, не парываюць сувязей са сваёй alma mater. І мы заўсёды рады бачыць і іх, і іншых прадстаўнікоў рэгіянальнай сферы культуры Беларусі на сваіх навукова-практычных канферэнцыях.

— Вы згадалі пра аспірантаў. А колькі іх цяпер навучаецца ў БДУКМ? Ці паспяхова дзейнічае савет па абароне дысертацый, створаны пры ўніверсітэце?

— На сёння ў нас у дактарантуры і аспірантуры навучаецца 186 чалавек, з якіх 10 — дактаранты, 89 — аспіранты Беларусі, а 87 — аспіранты з Кітайскай Народнай Рэспублікі. Наш Савет па абароне дысертацый па культуралогіі і мастацтвазнаўстве, згодна з данымі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца адным з пяці найбольш эфектыўных саветаў краіны. Таксама ў нас працуе Савет па абароне дысертацый па тэорыі, методыцы і арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці і бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве. Работы спецыялістаў, якія абараняюцца ў БДУКМ, вылучаюцца яснай распрацоўкай навуковых тэм, што пацвярджаецца высокімі ацэнкамі экспертаў з іншых навучальных і навукова-даследчых устаноў Беларусі.

— А якая тэматыка кандыдацкіх і доктарскіх работ пераважае ў Савеце па абароне дысертацый? На якія навуковыя і даследчыя праблемы ў сферы культуры звяртаецца найбольшая ўвага?

— Найбольш спецыялістаў абараняюцца па спецыяльнасцях "Тэорыя і гісторыя мастацтва", "Тэорыя і гісторыя культуры", найменш — па бібліятэказнаўстве. З найбольш цікавых дысертацый апошняга часу магу адзначыць работы Алены Пагоцкай "Мастацкастылявая эвалюцыя сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў у Беларусі канца XVI — пачатку XX стагоддзя" і Марыны Татарэвіч "Культурная інтэграцыя носьбітаў мусульманскай традыцыі на тэрыторыі Беларусі". Таксама ў нас абараняюцца і замежныя спецыялісты, напрыклад, з Кітайскай Народнай Рэспублікі.

— Наколькі я ведаю, цяпер у вас ёсць планы па стварэнні яшчэ аднаго навуковага часопіса. Магчыма, у ім былі б дарэчы і навуковыя публікацыі аўтараў рэгіянальнай сферы культуры?

— Так, на сёння ў нас ёсць "Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў", а з восені гэтага года мы мяркуем выдаваць яшчэ адзін навуковы часопіс "Арт-форум", дзе будзем публікаваць матэрыялы з галіны тэорыі і гісторыі культуры, тэорыі і гісторыі мастацтва. Гэты часопіс будзе, у першую чаргу, друкаваць работы нашых аспірантаў і магістрантаў, але ж, натуральна, мы адкрыты да супрацоўніцтва і з рэгіянальнымі аўтарамі. Галоўнае, каб навуковыя артыкулы былі яснасныя, цікавыя, напісаныя на высокім навуковым узроўні. Дарэчы, мы таксама выдаём і навуковую літаратуру. Напрыклад, нядаўна з друку выйшла калектыўная манаграфія "Ацэнка эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк па стварэнні электронных інфармацыйных рэсурсаў", падрыхтаваная супрацоўнікамі нашага ўніверсітэта.

— А наколькі гэтая і іншыя вашыя выданні запатрабаваны ў рэгіёнах? Ці ідзе абмеркаванне ўзнятых вашымі спецыялістамі праблем у рэгіянальных установах культуры — музеях, бібліятэках, СДК ці РДК?

— Думаю, нашы публікацыі, нашы кнігі па розных тэмах культурнага жыцця Беларусі знаходзяць важкі водгук у рэгіянальных установах культуры, у тых жа раённых бібліятэчных сістэмах. Сведчанне гэтаму — павелічэнне попыту на нашых спецыялістаў у рэгіёнах ад работадаўцаў, бо часта на аднаго спецыяліста паступае адразу некалькі, а то і пяць-сем заявак. Гэта сведчыць пра тое, што ў рэгіёнах ведаюць пра нашы дасягненні, пра нашу навуковую базу, пра тыя навуковыя веды, якія мы перадаём нашым студэнтам, робячы з іх высакакласных і запатрабаваных спецыялістаў, здольных да аналізу тых ці іншых праблем і пытанняў сферы рэгіянальнай культуры.

— А ўвогуле, наколькі моцная сувязь БДУКМ з рэгіёнамі, з установамі культуры? Ці ладзіце вы сумесныя праекты?

— Часам ладзім, хоць, можа, не так часта, як хацелася б. Напрыклад, нядаўна, 25 чэрвеня, у Барысаве, сёлетняй Культурнай сталіцы Беларусі, ладзілася канферэнцыя "Падтрымка моладзевых ініцыятываў і стартапаў у сферы культуры ў дзяржавах— удзельніцах СНД". Мерапрыемства прайшло ў рамках правядзення Міжнароднай выставы "ART EXPO" дзяржаў-удзельніц СНД. Мы з'яўляліся адным з арганізатараў названай канферэнцыі, на якой ўдзельнікі — а гэта студэнты, выкладчыкі ВНУ сферы культуры, прадстаўнікі СМІ і грамадскіх арганізацый з многіх краін, — змаглі абмеркаваць шматлікія праблемныя пытанні, метады і вопыт падтрымкі моладзевых ініцыятываў і стартапаў у сферы культуры ў дзяржавах — удзельніцах СНД.

— Там, на канферэнцыі, былі прадэманстраваны і тыя іміджавыя праекты, у якіх удзельнічае Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў?

— Так, мы паказалі калегам з розных краін два сваіх праекты. Першы, пад назвай "Беларуская дуда" прадэманстраваў кандыдат мастацтвазнаўства, вядучы навуковы супрацоўнік універсітэта Аляксандр Сурба. Другі міжнародны выставачны праект называецца "108 хвілін. Дарога ў космас", быў прысвечаны 60-годдзю з часу першага палёту чалавека ў касмічную прастору. Гасцям канферэнцыі гэты праект прэзентавала студэнтка БДУКМ Наталля Трус. Названы праект, да слова, быў рэалізаваны сумесна ўстановамі і арганізацыямі Беларусі і Расіі пры падтрымцы Міністэрства культуры Беларусі, пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь, Расійскага цэнтра навукі і культуры ў Мінску. На выставе ў Нацыянальным гістарычным музеі былі прадэманстраваны ўнікальныя артэфакты, якія выкарыстоўвалі падчас сваіх касмічных палётаў Юрый Гагарын, Валянціна Церашкова, а таксама экспанаты, якія расказвалі пра Пятра Клімука, Уладзіміра Кавалёнка, Алега Навіцкага — ураджэнцаў Беларусі, якія таксама неаднойчы пабывалі ў космасе.

— Нядаўна я быў на рэспубліканскім семінары, што ладзіўся ў сценах БДУКМ. Напрыканцы мерапрыемства гасцям паказалі музейную экспазіцыю "Скарбы мастацтваў: сувязь часоў". Гэта таксама частка навуковай дзейнасці ўніверсітэта?

— Так, безумоўна. Аснову названай вамі музейнай экспазіцыі, якую мы адкрылі 14 чэрвеня, складаюць творы розных відаў мастацтва: музыкі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, мастацтва кнігі, створаныя як у розных жанрах і тэхніках, так і ў розныя перыяды гісторыі. У музейнай экспазіцыі прадстаўлены гістарычныя экспанаты, сабраныя Навукова-метадалагічным Цэнтрам традыцыйнай беларускай культуры і работы студэнтаў — стыпендыятаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, лаўрэатаў міжнародных конкурсаў і дыпламантаў рэспубліканскіх выстаў.

— І апошняе. Калісьці мы друкавалі шмат матэрыялаў пра навуковыя даследаванні, зробленыя ў БДУКМ. Магчыма, вашым выкладчыкам было б цікава апублікаваць у "К" свае артыкулы, пазнаёміўшы нашых чытачоў з апошнімі дасягненнямі спецыялістаў?

— Безумоўна, мы будзем рады супрацоўніцтву з газетай "Культура". У нас сёння на кафедрах распрацоўваюцца 24 навуковыя тэмы, таму, мяркую, расказаць і прадэманстраваць свае знаходкі і дасягненні на старонках рэспубліканскага друку будзе рады кожны выкладчык нашага ўніверсітэта.

К

КУЛЬТУРА
WWW.KIMPRESS.BY
№ 28 / 10 ЛІПЕНЯ 2021 г.

Іншы час, іншае мастацтва

Кафедра манумэнтальна-дэкаратыўнага мастацтва нашай мастацкай акадэміі не магла застацца ў баку ад нацыянальнага фестывалю "Манумент 21". Бо менавіта ў гэтай навучальнай установе і на гэтай кафедры рыхтуюцца прафесіяналы, якія мусяць умацоўваць патэнцыял беларускай мастацкай школы і развіваць яе традыцыі.

Фрагменты экспазіцыі.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ / Фота аўтара

У рамках фестывалю на адной з экспазіцыйных пляцовак БДАМ, у галерэі "Акадэмія", адкрылася выстава работ студэнтаў згаданай кафедры. Гэта курсавыя і дыпломныя работы, якія дазваляюць зразумець логіку і мэты навучальнага працэсу ў БДАМ і адначасова пабачыць эстэтычныя арыенціры будучай мастацкай эліты краіны.

Тое, што мы сёння называем нацыянальнай мастацкай школай, калі гаворка ідзе пра манументалістыку, мае адносна кароткую гісторыю. Толькі ў пасляваенны час такое мастацтва стала насамрэч запатрабаваным грамадой і склаліся ўмовы для ягонага развіцця. Кропкай адліку і часам нараджэння можна лічыць момант, калі ў нашай акадэміі, якая тады была Тэатральна-мастацкім інстытутам, пачала дзейнічаць спецыялізаваная кафедра. Узначаліў яе выдатны мастак, якому вельмі пасуе вызначэнне "мэтр", — Гаўрыла Харытонавіч Вашчанка. Ягоная творчасць мела канцэптуальнай базай так званы "суворы стыль" з яго падкрэсленым сацыяльным зместам, у большай ці меншай ступені адпавядаючым устаноўкам "сацрэалізму". А почырк мастакоў гэтага напрамку — эстэтызаваная брутальнасць, быў зусім не "сацрэалістычным". Да таго ж Гаўрыле Харытонавічу была ўласцівая, бадай, максімальна магчымая ў той рэчаіснасці эмацыйнасць.

Увогуле гэта было мастацтва метафар і сімвалаваў, выяўленых у прадметна-рэалістычных абагульненых, але пры гэтым вельмі ўмоўных формах, дзе канрэтыка — побытавая ці гістарычная — прынцыповай ролі не адыгрывала. Нашу манументалістыку савецкай пары можна параўнаць з іканапісным каноном, дзе зыходна вызначаны субардынацыя сюжэтаў, выяў і абавязковы набор сімвалічных атрыбутаў. Вонкава яны, канешне ж, розныя, але сутнаснае падабенства ў няяўнасці.

Школа Вашчанкі рыхтавала мастакоў, якія мусілі рабіць фрэскі, сграфіта і мазаікі для сцен грамадскіх будынкаў, эстэтычна аздабляць вялікую прастору, творча супрацоўнічаць з архітэктарамі. Больш за тое — даволі часта менавіта манументалістыка мусіла прыкрыць хібы тыпавога будаўніцтва, якое абражала вока сваёй аднастайнасцю і манатоннасцю. Так, менавіта Гаўрыла Вашчанка быў ініцыятарам таго, каб ягоныя студэнты абараняліся не ўзорамі "папяровага манументалізму", але думалі пра аздобу інтэр'ераў тыпавых школьных будынкаў.

Юлія Цярэшка. "Без назвы".

Тыя, хто прыйшоў выкладаць на кафедру пасля Гаўрылы Харытонавіча, зыходзілі з іншай сітуацыі і, адпаведна, з іншых прынцыпаў. Само жыццё змяніла маштабы манументальнага мастацтва. Яно перайшло ў іншы, лакальны, фармат. Ды і архітэктурны дызайн, які набраў моц, пасунуў манументалістыку з яе кананічных тэрыторый. Як вынік: у беларускім манументальным мастацтве атрымалі распаўсюд станковыя формы. Стала нормай, што манументалісты абаранялі дыпломы фактычна станковымі карцінамі, адно што прывязанымі да канкрэтных сцен.

Гэту сітуацыю можна было ўспрыняць па-рознаму. У чымсьці гэта была страта, а ў чымсьці і набытак. Так у новых умовах манументалістыка, страціўшы звыклую маштабнасць, узбагацілася псіхалагізмам, незапатрабаваны раней пачуццёвасцю, глыбіннай распрацоўкай формы, і новымі выяўленчымі эфектамі, запазычанымі ў іншых творчых цэхах. Менавіта гэты трэнд мы бачым і на студэнцкай выставе, прымеркаванай да фестывалю "Манумент 21".

Акадэмія па-ранейшаму высока трымае планку якасці, бо майстэрства і здольнасць да самастойнага мыслення нават у вучэбных заданнях адчуваецца ў работах студэнтаў першых курсаў. На выставе эфектна глядзеўся сёлетні дыпломны праект Марыі Кручковай і Ганны Плотнікавай "Нараджэнне свята" — аздоба інтэр'ераў Расійскай акадэміі тэатральнага мастацтва, вядомай пад абрэвіятурай "ГИТИС". Праект прадстаўлены ў фатаграфіях і фрагментах у матэрыяле. Гэта прыгожая абстракцыя. Працягам выставы можна лічыць і іншыя сёлетнія дыпломы, бо яны рэалізаваныя ў інтэр'ерах самой акадэміі. Так, нарэшце, прыстойную манументальную аздобу атрымаў шматпакутны вучэбны тэатр БДАМ. Той, хто чытае нашу газету, ведае, як цяжка ішла рэканструкцыя гэтага неабходнага акадэміі аб'екта, якія канфлікты ўзнікалі паміж замоўцамі і будаўнікамі. Цяпер глядзельная зала вельмі далікатна ўпрыгожана матывамі беларускай прыроды. На абароне прагучала думка, што гэта даніна памяці Гаўрылу Харытонавічу, які надзвычай таленавіта апяваў роднае Палессе, зрабіўшы рэалі свайёй малой радзімы агульнацыянальным здабыткам і брэндам.

Магчыма, той, хто прызвычаіўся ўспрымаць манументальнае мастацтва выключна як ідэалагічна акрэсленае і пафаснае, будзе выставай расчараваны. Я ж дазволю сабе меркаванне, што яно хутчэй наблізілася да людзей, бо звяртаецца ўжо не столькі да вялікіх людскіх мас, як да розуму і пачуццяў кожнага гледача паасобку. Скажам так, страшіўшы частку сваёй кананічнай маштабнасці, яно набыло інтэлектуальную глыбіню. Прынамсі, скіравана ў гэтым напрамку К

Дарына Даўгадзіліна. "Мацярынства".

Валерыя Гараднічава. "Каласы пад сярпом тваім".

Паліна Белая. Эскіз вітража на тэму "Прырода Беларусі".

Фрагменты экзпазіцыі.

Фрагменты экспазіцыі.

Адным словам — магія

У цэнтры сталіцы адкрылася новая галерэя сучаснага мастацтва "Арт Фабрыка". Адным з яе першых мерапрыемстваў стала выстава Opus Magnum. Initium, дзе жывапіс Уладзіміра Кандрусевіча-малодшага спалучаўся з вершамі і прэзентацыяй балета паводле яго карцін. Праект атрымаўся міжнародным: аўтарам ідэі выступіла грузінская рэжысёр Тэкла Гелбахіяні, якая запрасіла да супрацоўніцтва грузінскага кампазітара і беларускага харэографа.

Надзея БУНЦЭВІЧ / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Харэаграфічны перформанс па матывах работ Уладзіміра Кандрусевіча.

У назве праекта не толькі спляліся нейкія канцэпцыйныя моманты, але і зададзена ўстаноўка на будучыню. Латынь — спасылка на мінуўшчыну і вечныя-спрадвечныя каштоўнасці, пачынаючы з біблейскіх гісторый і запаветаў. Opus — як повязь з музыкай, дзе гэтае азначэнне чарговага твора не проста скарыстоўваецца і дагэтуль, але з'яўляецца асноўным. Magnum перакладаецца як "выдатна" і спраўджваецца на ўсе сто. Initium — пачатак, бо цалкам балет можна будзе ўбачыць увосень. Не менш сімвалічна і месца галерэі — будынак былой фабрыкі-кухні. Только замест харчовых страў, пастаўленых "на паток", тут гатуюць-рыхтуюць выкшталцоныя мастацкія рэчы.

Пачалося з таго, што Тэкла, пазнаёміўшыся з працамі беларускага мастака, вырашыла зрабіць іх больш "бачнымі" для шырокай грамадскасці. Сувязь з харэаграфіяй напрошвалася сама сабой: ледзь не ў кожнай карціне занатаваны пластыка і рух чалавечага цела. А праз іх — глыбокія філасофскія думкі. Ёсць і ўласна балерыны на пуантах, але гэта хутчэй прыватны выпадак з агульнай "калекцыі". Дый унутраная музычнасць карцін — зусім не толькі ў каларытных медных духавых у руках анёлаў ("Рэквіем").

Сын знакамітага кампазітара, "караля мюзікляў" Уладзіміра Кандрусевіча, мастак свядома прасочвае сваю сувязь з бацькоўскімі генамі: экспазіцыя пачынаецца з "аўтапартрэта" рукі з пэндзлем, а завяршаецца выявай бацькоўскіх рук за фартэпіённай клавіятурай у час імправізацыі. Дый на некаторых іншых палотнах асабіста я ўбачыла шматлікія перазовы з бацькоўскімі спектаклямі — з тым жа балетам "Мефіста" ў нашым Музычным тэатры. Прычым не са сцэнаграфіяй ці мізансцэнамі — з самой музыкай і агульнай тэатральнай атмасферай.

У кожнай карціне — парадаксальнасць і філасофскія глыбіні, сінтэз жанраў, відаў мастацтва, сучаснасці і мінуўшчыны. Гэта і нацюрморты з маленькімі чалавечкамі, якіх ну ніяк немагчыма назваць ліліпутамі. Бо перад намі — мадэль сусвету, дзе "Гармонія" перададзена праз адзінаборствы ў кухоннай раковіне, што быццам чорная касмічная дзірка зацягвае ў вір хуткаплыннага часу. Гэта і "Зваротная перспектыва" з кентаўрам, русалкай, язычніцка-біблейскай козачкай, чарапахай (з тых, што трымаюць на сябе зямлю) — і камп'ютарам, а таксама шматпавярховікам, з якога ляцяць долу людзі. "Малітва" — тыя ж "фіксікі", як назваў маляваных чалавечкаў хтосьці з наведвальнікаў, каля вялізнай ступні з выразнай пятай. Ці на іншых карцінах — побач з механізмамі, на фоне якіх яшчэ больш кранальна адчуваецца крохкасць чалавечага жыцця ў перамоўванні гістарычнымі жорнамі. "Вырай" — з чорнакрылымі анёламі. "Паветраная трывога" — чарговая спасылка да роспісу храмаў (а Уладзіміра Кандрусевіча часцяком запрашаюць да такой працы), мастакоў Адраджэння і адначасова да сучаснай урбаністыкі з пазнавальным відарысам.

Міфалагічная аснова мастацкага мыслення творцы як нельга лепей спалучаецца са знойдзенай ім тэхналогіяй — алеем па іржавым метале, прычым у аб'ёмным прасторавым вымярэнні і са спасылкамі да царкоўных іканастасаў, распісаных па дрэве.

Ідэя руху вядзе не толькі да пасляўоўнага лінейна-лінеарнага разгортвання гісторыі, але і наўпрост да кінакадраў, прычым не толькі "спыненых". Кампазіцыя "Кулёк", дзе гімнаст перакульваецца праз галову, складаецца з 42-х выяў-кадраў. І гэта лічба вядзе не толькі да праславутых 24-х кадраў у секунду, толькі ў ракаходзе, але і да тэорыі сямігадовых цыклаў, пра якія распавядаў яшчэ Гіпакрат. А побач — кінаверсія таго ж куляння. Чым не своеасаблівы "дыпціх"?

Сугучнасць мыслення мастака і маладога, але ўжо знанага харэографа Сяргея Мікеля вывялася ў паказаных фрагментах з будучага балета. Артысты нашага Музычнага тэатра Алена Германовіч, Канстанцін Белахвосцік, Дар'я Сытнік і Яўген Ермаловіч траплялі на сцэну, у адпаведнасці з парадаксальнасцю агульнай задумы, у прамым сэнсе слова праз акно. Гледачы сабраліся і перад невялічкім подыумам, і на вуліцы, літаральна абкружыўшы балетныя пары ў абодвух прасторавых вымярэннях. Музыка грузінскага кампазітара Давіда (Дато) Еўгенідзе, найбольш вядомага праз кінапрацы, амаль распусцілася ў харэаграфіі, стаўшы нябачнай часткай відовішча. Целы артыстаў гарманізавалі дзею, а тэатральнае падсвятленне надавала жывапісу новае "варыяцыйнае" гучанне.

Нават у такім далёкім ад завяршэння выглядзе стала відавочна, што такі ва ўсіх сэнсах "пластычны" сінтэз на мяжы ўбачанага "на свае вочы" і адчутага "трэцім вокам" — найбольш адметная рыса творчага стылю С.Мікеля. Яна выявілася ў яго студэнцкай аўтарскай вечарыне харэаграфічных мініяцюр, потым амаль страцілася ў "вялікіх" балетах, што мадулявалі да харэадрамы, і зноў расцвіла ў цяперашняй пластычнай падсвядомасці, стаўшы яшчэ і запрашэннем на хуткую прэм'еру спектакля "Пад · Свядомасць" у Музычным тэатры.

Інтэрактыў, шчодра замешаны на сінтэзе мастацтваў, быў працягнуты злёгку тэатралізаванай экскурсіяй па выставе, праведзенай самім мастаком, вершамі Паўла Міхалькевіча — як змешчанымі побач з карцінамі, так і прачытанымі самім паэтам. Дарэчы, непасрэдная сустрэча з творцамі, што давала магчымасць пачуць пра задуму "з першых вуснаў", абмянялася думкамі, выказаць свае ўражанні непасрэдна самому аўтару, аказалася не адзінай: праз тыдзень адбыўся "другі тайм" — праўда, ужо без балета. Але ж самі карціны Уладзіміра Кандрусевіча настолькі пластычныя ды рухавыя, што "ажываюць" і без дадатковых прылад — дастаткова толькі ўгледзецца ў іх. І убачыць не целы як знешнюю абалонку, а аголеныя душы, што сыходзяць з выяў і лётаюць у паветры, трапляюць у нашу свядомасць і падсвядомасць, абуджаючы ў іх генетычную памяць усяго чалавецтва. Упэўнена: такім жа магічным стане пластычны Opus Magnum у час восеньскай прэм'еры і далейшых рэпертуарных паказаў.

К

КУЛЬТУРА
WWW.KIMPRESS.BY
№ 28 / 10 ЛІПЕНЯ 2021 г.

Фэст для таты

На пачатку 1980-х нам, маладым веткаўскім газетчыкам, мастадонты ад журналістыкі прыводзілі вось які прыклад прафесіяналізму: “Прыехаў са сталіцы спецкар. Мэта: напісаць нарыс пра камбайнера. Дык як сеў той журналіст у кабіну да хлебароба, так да абеду і не вылазіў. Камбайн на жытнёвым палетку шчыруе, а ў кабіне два профі гутарку вядуць… У выніку матэрыял як звон атрымаўся. Вучыцеся!”
Мы вучыліся. Вельмі хутка зразумелі, што прыклад — не надта красамоўны. Журналіст сеў у кабіну, каб хлебаробу замінаць, а той высокаму госцю адмовіць не змог, а таму палову рабочага дня працаваў са стратамі. Мы высвятлялі ў агранома: пэўная доля ўраджаю так на ржышчы і засталася. Спакваля ў мяне сфармавалася сваё бачанне прафесіяналізму. Гузакоў пры гэтым набіў шмат, але пераканаўся: каб зазірнуць у душу чалавеку, неабавязкова хадзіць за ім тыдзень ці месяц. Дастаткова ў вочы паглядзець, на рукі, на вынік працы, паслухаць як будучы герой нарыса пра жонку распавядае, пра дзяцей, пра вясковыя праблемы. З усяго гэтага партрэт пакрысе і складаецца.
І свой канкрэтны прыклад прафесіяналізму ў мяне назапасіўся.

На здымках:
1 Лідскі фэст — для ўсіх.
2 Азёрнае свята на возеры Белае, што на Полаччыне.
3 На Свіслаччыне сабраліся землякі.
4 15-гадовая спявачка Валерыя Хаўтур — пераможца жыровіцкага праекта “Таленты сяла”.
5 Выстава народных музычных інструментаў Віцебшчыны.

Яўген РАГІН

Вось ён. У Нараўлянскім раёне сустрэлі мы маладзенькую бібліятэкарку. Ну, зусім зялёную. Як толькі даведалася, хто мы, паціху пачала па сценцы спаўзаць ад страху. І рады не далі, каб да нармальнага жыцця вярнуць. Здалі на рукі старшыні сельсавета і далей паехалі. Шкадавалі, бо было пра што пагаварыць. У невялічкай сельскай бібліятэцы дзяўчына сабрала неверагодную калекцыю кніг, што вучылі, як вяскоўцам выжываць на забруджанай радыяцыяй зямлі. І гэта была не фармальная выстава. Кніжкамі пастаянна карысталіся! Больш такога ёмістага тэматычнага збору кніг я на Гомельшчыне і Магілёўшчыне не бачыў. Маладзенькая дзяўчынка з Нараўлянскага раёна, якая спалохалася журналістаў, не пабаялася паўстаць супраць радыяцыі, каб падтрымаць сваіх вяскоўцаў. Такіх бы паболей.

Ведаю, на **Ашмяншчыне** ў сферы культуры профі хапае. Да прыкладу, загадчык сельскага клуба аграгарадка **Баруны** Алена Альшук. Вось пра што яна распавяла: “*29 чэрвеня ўсе дарогі ў Барунах вялі да касцёла святых апосталаў Пятра і Паўла, ля якога ўпершыню прайшоў фэст “Цудадзейная крыніца”. Сюды штогод з'язджаюцца і прыходзяць вандроўнікі і пілігрымы з усіх куткоў краіны, каб папрасіць у Маці Божай апекі і зачэрпнуць вады з гаючай крынічкі. Вось і сёлета тут ладзіўся кірмаш, гучалі музыка, песні. Пачаўся фэст тэатралізаваным пралогам “З вытокаў цудадзейнай крыніцы”. Пробашч касцёла ксёндз Павел даў старт мерапрыемству. Выступілі творчыя калектывы з* **Астраўца**, **Залесся** *і* **Гальшан**. *Потым была святая імша ў касцёле і працэсія ў гонар цудадзейнай крыніцы*”.

Чарговая ашмянская навіна — ад тамтэйшых метадыстаў. Гаворка — пра Купалле па-Пятрульску. Штогод жыхары вёсачкі **Пятрулі** запрашаюць на свята гасцей з усёй Беларусі. Уся справа ў тым, што тут неверагодны водар купальскіх траў ды кветак. 26 чэрвеня на падворку Сяргея і Юліі Болзанаў было завозна і пахла смажанінай. Гасцей віталі Купала і Купалінка. А потым закружыліся ўсе пад песні народнага ансамбля народнай песні “Жытніца” аддзела культуры і вольнага часу аграгарадка **Кракоўка**.

А вось праект **Жыровіцкага** Цэнтра культуры **Слонімскага** раёна. Праект маладзёжны, анлайнавы, называецца “Таленты сяла”. Інакш кажучы, у маладзёнаў з аддаленых паселішчаў з'явіўся шанц стаць знакамітымі. 15-гадовая Валерыя Хаўтур з аграгарадка **Васілевічы** гэты шанц выкарыстала напоўніцу: па выніках анлайн галасавання заняла ў конкурсе першае месца. А ўсяго ў праекце была задзейнічана моладзь з 14 аграгарадкоў Слонімшчыны.

І апошняя на сёння навіна са **Слонімскага** раёна. У мясцовым аграгарадку **Сялявічы** прыдумалі свята экалагічнай творчасці. Прыдумалі і ўпершыню правялі. Былі падведзены вынікі раённага праекта “Экалогія вачыма дзяцей і моладзі”. Праект стартаваў узімку, мэтай яго стала павышэнне экалагічнай культуры сельскіх дзяцей, арганізацыя іх актыўнага вольнага часу. Так з дапамогай работнікаў культуры ўзнікла своеасаблівае творчае экалагічнае аб'яднанне. Тут было рэалізавана шмат добрых ідэй. У выніку пачала дзейнічаць выстава “Класныя штучкі са смецевай купкі” прайшоў конкурс лепшага вясковага добраўпарадкавання і азеляненння, а таксама конкурс на самы арыгінальны эка-касцюм. Завяршылася свята футбольным матчам паміж камандамі суседніх аграгарадкоў.

“*Чароўныя гукі майстэрства*” — *так называецца выстава народных музычных інструментаў* **Віцебшчыны**, — напісала начальнік аддзела Віцебскага абласнога метадычнага Цэнтра народнай творчасці Ала Лялькіна. — *Выстава працуе ў нашай установе. Тут прадстаўлена больш за сотню экспанатаў XIX і XX стагоддзяў: струнныя, духавыя, ударныя і мембранныя, нават — якія самі гучаць. Гэта цымбалы, трашчоткі, лыжкі, гуслі, скрыпкі, жалейкі, калёсныя ліры, этнаграфічныя артэфакты і мастацкія выявы музычных інструментаў, у тым ліку зробленых рукамі майстроў вобласці*”. Да слова, у другой выставачнай зале працуе персанальная выстава “Час лялек” народнага майстра Беларусі з **Лепеля** Наталлі Петуховай. Акцыя доўжыцца ў межах арт-праекта “Партрэт майстра”. Наталля Аркадзьеўна валодае рознымі тэхнікамі ткацтва, даўно і плённа працуе са сваімі гурткоўцамі ў Лепельскім Доме рамёстваў. У калекцыі — больш за тры дзясяткі лялек, апранутых у народныя строі Беларусі з выкарыстаннем ручной вышыўкі і ткацтва. Ёсць рэчы аўтарскія, а ёсць і аўтэнтычныя.

Сябры літаратурнага клуба, які ўзначальвае пісьменнік і журналіст Вячаслаў Корбут, сабраліся ў **Гудзевіцкай** сельскай бібліятэцы, што ў **Мастоўскім** раёне. Арганізаваў сустрэчу для аматарскага аб'яднання “Залаты ўзрост” сябра **Гродзенскага** абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Іваноўскі. А напісала пра мерапрыемства бібліятэкар Гудзевіцкай установы Валянціна Пронька.

“*У рамках абласнога праекта* “**Гродзенскі** *ЛітФэст*” *і падчас музычнага фестывалю* **Ваўкавыская** *раённая бібліятэка запрасіла ахвотных на інтэрактыўную пляцоўку “Літаратурны дворык — VolkBookMusic”*, — распавяла метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу Ваўкавыскай раённай бібліятэкі Вольга Шалястовіч. — *А яшчэ дзейнічалі “хуткая бібліятэчная дапамога”, майстар-клас па лозапляценні, літаратурнае караоке. Можна было пагуляць у квэст “Вакол ды каля бібліятэкі*”.

Цяпер — нізка навін з **Лідчыны**. “Маладзёжная хваля” — гэта фэст маладзёвай субкультуры. Па традыцыі на яго ходзяць сем'ямі. Таму і ўзнік паралельны “Тата-фэст”, каб татам і мамам, бабулям і дзядулям не было сумна. Балазе, сумна не бывае нікому. Асабліва актыўна мінае дзень для татаў, якія адстойваюць у конкурсах гонар сваёй сям'і. Пераможцы атрымліваюць цішоткі з лагатыпам сямейнага фэсту.

Народны тэатр “Батлейка” **Лідскага** аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры стаў пераможцам шостага адкрытага рэгіянальнага фестывалю батлеечных тэатраў “Чароўны свет Батлейкі”.

“*27 чэрвеня пасярод Белавежы, у аграгарадку* **Ціхаволя** *прайшоў фэст “Сустрэча землякоў*”, — напісала намеснік дырэктара **Свіслацкага** раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці Святлана Дзянісава. — *Прысутных частавалі пірагамі, юшкай, блінамі ды гарбатай. А потым былі танцы*”.

Не горшыя бліночкі і ў **Ханявіцкім** сельскім клубе, таго ж Свіслацкага раёна. Загадчык памянёнага клуба Алена Пісар паведаміла пра свята квашаных(!) бліноў “Ханявіцкія бліночкі”. Летась з-за пандэміі свята адмянілі. Народ паспеў засумаваць па духмяных блінцах. І вось напяклі іх сёлета аж больш за 20 гаспадынь з бліжэйшых вёсак і гарадоў. Апрача бліноў былі торты, пончыкі, наліснікі, піцы... Карацей, бывай, талія! А яшчэ прайшоў конкурс на лепшы кухонны фартушок. Вось такое, блін, смачнае свята!

Напісала метадыст **Карэліцкай** райбібліятэкі Наталля Казарэз: “*Тыдзень моладзі пачаўся ў нас Днём спорту. Бібліятэкары пачалі дзень з зарадкі, потым на роварах скіраваліся да помнікаў воінам-вызваліцелям, дзе ўсклалі кветкі. Актыўна дзейнічала аўтабібліятэка. Лялечны тэатр “Васілёк” райбібліятэкі завітаў са спектаклем у аграгарадок* **Палужжа**...”

На развітанне — дзве навіны з **Полацкага** раёна. Аўтар абедзвюх — рэдактар Полацкага раённага Цэнтра культуры Кацярына Паўловіч. Свята азёрнай хвалі адбылося на возеры Белае ля вёскі **Азіна**. Возера славіцца цудоўным пляжам, што добраўпарадкаваны сям'ёй прадпрымальнікаў Ткачэнкаў. Таму і свята ля вады ладзіцца не першы год. Натуральна, не абыходзіцца без конкурснай юшкі і чэмпіянату па лоўлі ракаў рукамі. Самае то, што ў такую спёку!

Яшчэ адно свята **Полаччыны** — “Заазёрская бераззуха”. Ладзіцца ў шосты раз. Свой бярозавы край ушаноўваюць агульнымі намаганнямі загадчык **Заазёрскага** СДК Жанна Міхно, культарганізатар установы Марына Белавус, педагог ДШМ Алена Сцержанава, бібліятэкар Людміла Пашкевіч. Вельмі эфектыўная, як паказвае час, творчая кааперацыя.

Беражыце сябе, шаноўныя, і пішыце пра цікавае!

Таварыства Саюза беларусаў Латвіі з беларускім ручніком.

Дэлегацыя Саюза беларусаў Латвіі на выставе СМІ ў Беларусі.

Радзіма — галоўная крыніца натхнення

Алена Лазарава, старшыня Саюза беларусаў Латвіі, кіраўнік Рыжскага беларускага грамадства "Прамень".

Заканчэнне. Пачатак на старонцы 3.

— У 2011 годзе вы, як грамадскі дзеяч беларускай дыяспары, былі абраны ў Парламент Латвійскай Рэспублікі — XI Сейм Латвіі. Што вы можаце сказаць наконт сваёй працы там?

— Так, я ўзначаліла дэпутацкую групу па супрацоўніцтве парламентаў Латвіі і Беларусі. У той год таксама адбыўся круглы стол за адмену санкцый ЕС супраць Рэспублікі Беларусь — "Беларусь — неад'емная частка Еўропы. Кансалідацыя беларусаў замежжа". Круглы стол прайшоў з удзелам беларусаў Латвіі, Літвы, Эстоніі, Украіны і Расіі. Былі адпраўленыя звароты да кіраўнікоў дзяржаў ЕС, членаў Савета Еўропы і дэпутатаў Еўрапарламента з заклікам весці канструктыўны дыялог з Беларуссю. З 2014 года я з'яўляюся членам Кансультатыўнага камітэта прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў пры Міністэрстве культуры Латвіі. Сёлета для мяне было вялікім гонарам стаць удзельніцай VI Усебеларускага народнага сходу.

Традыцыйнымі мерапрыемствамі беларусаў Латвіі з'яўляюцца правядзенне Дзён беларускай культуры, удзел у конкурсе даследчых работ "Беларусы Латвіі. Мінулае і сучаснасць". Таварыствы цікава і яскрава адзначаюць народныя беларускія святы: Каляды, Масленіцу, Гуканне вясны, Купалле, Свята бульбы... Нас ведаюць, любяць і паважаюць у Латвіі. Мерапрыемствы наведваюць як беларусы, так і латышы, прадстаўнікі іншых нацменшасцяў.

У 2016 годзе таварыствы пачалі праект "Ручнік — традыцыйны элемент беларускай культуры", які працягваўся два гады. Вышывалі сяміметровы льняны ручнік усе таварыствы Саюза беларусаў Латвіі. Завяршыўся праект у 2018 годзе, і 23 лістапада ў Прэзідэнцкім палацы, падчас правядзення форуму нацменшасцяў "Ад інтэграцыі да аб'яднанага грамадства", прайшла ўрачыстая яго перадача Прэзідэнту Латвіі Раймандсу Вейанісу, як сімвалічнае пажаданне міру і дабрабыту для ўсяго латвійскага народа, у гонар 100-годдзя Латвійскай Рэспублікі і 15-годдзя Саюза беларусаў Латвіі. У 2021 годзе падчас Усебеларускага народнага сходу сяміметровы льняны ручнік ад беларусаў Латвіі быў перададзены Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку, і будзе захоўвацца ў Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці ў Мінску.

У 2019 годзе найстарэйшы беларускі калектыў — ансамбль беларускай песні "Надзея" Рыжскага беларускага таварыства "Прамень" і актывісты Саюза беларусаў Латвіі прынялі ўдзел у здымках фільма "Спадчына" кінастудыі "Беларусьфільм". Вельмі ўдзячныя аўтару ідэі і сцэнарыя Наталлі Голубевай, рэжысёру Людміле Клінцовай і ўсёй здымачнай групе за супрацоўніцтва.

— Якую падтрымку ваша суполка на сёння атрымлівае з Беларусі? І якая яшчэ дапамога падаецца вам найбольш істотнай?

— Вельмі ўдзячныя за падтрымку калектыву Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Рэспублікі Беларусь і асабіста Вользе Антоненка, апарату Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Рэспублікі Беларусь і асабіста Леаніду Гуляка ды Аляксандру Румаку. Яркай і незабыўнай падзеяй з'яўляецца ўдзел нашых калектываў у фестывалях мастацтваў беларусаў свету 2011, 2014 і 2017 гадоў, а таксама штогадовы ўдзел рэдкалегіі газеты беларусаў Латвіі "Прамень" у праграме сустрэч з суайчыннікамі ў рамках выставы "СМІ ў Беларусі".

Заўсёды запамінаюцца і пакідаюць яскравыя ўражанні сустрэчы на радыё, у рэдакцыях газет, з журналістамі, выдатныя экскурсійныя праграмы з наведваннем культурна-гістарычных мясцін і прадпрыемстваў Беларусі. Штогод кіраўнікі нашых творчых калектываў Латвіі прымаюць удзел у навучальных семінарах. Вядома, запамінаюцца выдатныя падарункі: беларускія нацыянальныя касцюмы, кнігі, метадычныя матэрыялы, беларускія сувеніры.

Вялікае значэнне для нас мае прыезд у Латвію творчых калектываў з Беларусі для ўдзелу ў Днях беларускай культуры, фестывалях і іншых святочных мерапрыемствах, якія арганізуюць нашы таварыствы. Зазвычай прыём такіх дэлегацый адбываецца ў рамках праектаў, якія падтрымліваюць мясцовыя латвійскія органы самакіравання. Пры магчымасці важна падтрымліваць іх прыезд і з беларускага боку.

Калі казаць пра нашы пажаданні, то, вядома, важна працягваць усе праграмы супрацоўніцтва, яны сапраўды вельмі важныя для нас. Будзем удзячныя за забеспячэнне таварыстваў беларускай дзяржаўнай сімволікай — дзяржаўнымі сцягамі, сцяжкамі і значкамі, значкамі да Дня Перамогі, а таксама сувенірамі народнай творчасці. Для творчых калектываў актуальны абутак і галаўныя ўборы. І, вядома, неабходная дапамога ў арганізацыі паездак нашых латвійскіх беларускіх калектываў на фестывалі ў Рэспубліку Беларусь, бо для нас паездкі на Радзіму заўсёды значныя і з'яўляюцца крыніцай творчага і душэўнага натхнення. Трэба спрыяць паездкам моладзі ў Беларусь.

— Ці часта да вас трапляюць цікавыя госці з Беларусі (дзеячы культуры, навукоўцы і гэтак далей)?

— Вядома, нас звязвае шматгадовае супрацоўніцтва з многімі творчымі калектывамі з Беларусі, якія з'яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі нашых мерапрыемстваў. Некалькі разоў у Латвію прыязджалі Беларускі дзяржаўны ансамбль "Песняры", Беларускі народны фальклорны ансамбль "Вербіца" палаца культуры завода МАЗ. Часты госць у Латвіі — намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша, заўжды з цікавымі дыскусіямі, ідэямі, праектамі. У 2016 годзе ў круглым стале "Роля і магчымасці таварыстваў нацыянальных меншасцяў у захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў Латвіі" ўдзельнічала міжрадавы эксперт Рэспублікі Беларусь па захаванні матэрыяльна-культурнай спадчыны Ала Сташкевіч. Шматгадовае сяброўства нас звязвае з Наталляй Голубевай, вядомай беларускай пісьменніцай і сцэнарыісткай. Сяброўскія дачыненні захоўваюцца з Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя Максіма Танка, з іншымі арганізацыямі і ўстановамі Беларусі.

— Адно з самых важных пытанняў — забеспячэнне пераемнасці пакаленняў. Ці ёсць з гэтым праблемы ў вашай супольнасці — і калі так, то як вы іх вырашаеце? Можа, падзеліцеся нейкімі канкрэтнымі творчымі "ноў-хаў", якія дазваляюць прыцягнуць увагу моладзі да сваіх каранёў.

— У перыяд глабалізацыі для моладзі на першым плане стаяць пытанні прафесійных ведаў і навыкаў. Пытанні нацыянальнай ідэнтычнасці, захавання беларускай спадчыны сваёй сям'і ў гэтым узросце з'яўляюцца другаснымі. Бачачы прыклад бацькоў, як правіла, дзеці вяртаюцца да гэтай тэмы, калі пачынаюць займацца выхаваннем ужо сваіх уласных дзяцей. Так было і ў маім жыцці. Актыўна наведваць мерапрыемствы я пачала, калі сталі падрастаць дзеткі. Праз удзел у культурных мерапрыемствах у іх абуджаецца цікаўнасць да творчасці, да гісторыі і традыцый Беларусі. Часта моладзь хоча паглядзець Беларусь.

Мой сын і дочкі некалькі разоў адпачывалі ў Нацыянальным дзіцячым цэнтры "Зубраня", пасля паездак заўсёды вярталіся вельмі задаволеныя. Ім цікавыя актыўныя, добра падрыхтаваныя дынамічныя мерапрыемствы. Моладзь прыцягваюць імпрэзы, звязаныя з беларускай кухняй, спартыўныя мерапрыемствы. У рыжскім беларускім таварыстве "Прамень" пры падрыхтоўцы мерапрыемстваў мы стараемся прыцягваць маладое пакаленне. Але, як правіла, гэта бліжэйшыя сваякі, дзеці і ўнукі. Мае дзеці заўсёды дапамагаюць мне рыхтаваць імпрэзы. Сын вёў шматлікія беларускія святы, выкарыстоўваючы веды латышскай мовы, дочкі выступалі на мерапрыемствах і канцэртах, рыхтавалі прэзентацыі.

— Нацыянальныя суполкі здатныя не толькі захоўваць гістарычную памяць, але і папулярызаваць беларускую культуру ў іншых краях. Ці ёсць зацікаўленасць беларускім мастацтвам там, дзе вы жывяце? Якія захады, на вашую думку, найбольш эфектыўныя?

— Самыя эфектыўныя метады — гэта жывыя зносіны і наведванне Рэспублікі Беларусь. Часта самыя крытычныя словы гучаць з вуснаў тых людзей, якія ніколі не былі ў Беларусі. Вялікае значэнне мае супрацоўніцтва самакіраванняў і навучальных устаноў дзвюх краін. Напрыклад, выкладчыкі латвійскіх школ не раз ездзілі ў Беларусь на курсы павышэння кваліфікацыі, бо тут мала методык для выкладання ў школах на рускай мове, лагапедычных методык для рускай мовы.

— Сёння час шмат у чым дастаткова ўнікальны. Тэхналогіі, інтэрнэт, новыя формы працы дазваляюць беларусам замежжа жыць у самых розных кутках зямнога шару, але пры гэтым адчуваць сваю непасрэдную датычнасць да культурных традыцый сваёй краіны. Ці ёсць якія-небудзь прапановы па сумесным узаемадзеянні ў культурнай сферы, па прамоцыі культурных праектаў як на Радзіме, так і за яе межамі?

— Патрэбныя абмен паездкамі творчых калектываў, турыстычныя паездкі калектываў прадпрыемстваў, абмен дэлегацыямі журналістаў, школьнікаў, студэнтаў. Удзел у дзяржаўных культурных мерапрыемствах.

— Культура — тая сфера дзейнасці, якая, па сутнасці, з'яўляецца візітнай карткай любой краіны. Пры дапамозе культуры больш паспяхова ўсталёўваюцца, развіваюцца і эканамічныя сувязі. Беларусы, якія жывуць за мяжой, могуць спрыяць будаўніцтву краіны, мэтай якой стануць сур'ёзныя вышыні па многіх паказчыках у шэрагу сектараў эканомікі. Якія культурныя праекты, на ваш погляд, маглі б гэтаму садзейнічаць?

— Са свайго досведу мяркую, што заканамерны ланцужок: культура — палітыка — эканоміка. Культура — гэта сфера зносін, знаёмстваў, наладжванне кантактаў, азнаямленне з матэрыяльнай і нематэрыяльнай старонкамі краіны. Гэта шлях знаёмства і фарміравання даверу адно да аднаго. У далейшым вялікае значэнне мае дзяржаўная палітыка адкрытасці і інфармавання аб магчымасцях краіны. Напрыклад, на мерапрыемстве Дзён беларускай культуры ў Рызе, прысвечаным малой радзіме, мы шмат распавядалі пра магчымасці беларускіх рэгіёнаў. Прадпрымальнікам заўсёды цікава пачуць на такіх мерапрыемствах цікавую для сябе інфармацыю.

У нашай акадэмічнай бібліятэцы ёсць інфармацыйны цэнтр, дзе сабрана літаратура пра Беларусь, кожны можа з ёй азнаёміцца. Але гэта ўжо не грамадская праца, а праца самой бібліятэкі. Я думаю, што супрацоўніцтва з Латвійскай акадэмічнай бібліятэкай мае вялікі патэнцыял, нягледзячы на вопыт стварэння асобнага Беларускага інфармацыйнага цэнтра як грамадскай арганізацыі. Для прадпрымальнікаў важна ведаць законы інвесціравання і вядзення бізнесу ў Беларусі. Патрэбныя бясплатны доступ да заканадаўчых інтэрнэт-рэсурсаў Рэспублікі Беларусь, супрацоўніцтва з Латвійскай гандлёва-прамысловай палатай. Можна разгледзець магчымасць адкрыцця ў Рызе Дома Мінска па аналогіі з работай Дома Масквы. Гэта было б значным крокам у развіцці двухбаковых дачыненняў.

К

Сцвярджае выключнасць,

Значную ролю ў справе адраджэння нацыянальнай культуры, прапаганды яе здабыткаў, збірання і распаўсюджвання фальклорна-этнаграфічнай спадчыны адыгрывае рэспубліканскі конкурс “Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры”. Сёння конкурс — гэта не толькі пацвярджэнне выключнасці і індывідуальнасці бібліятэк, дэманстрацыя дасягненняў, але і абмен вопытам, самаацэнка сваёй работы, адкрыццё новых гарызонтаў, прыцягненне карыстальнікаў, стымул для творчасці і прафесійнага росту бібліятэкараў.

14 мая 2021 года ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў онлайн рэжыме былі падведзены вынікі XXIX рэспубліканскага конкурсу “Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры” за 2020 год. У склад кампетэнтнага журы ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, абласных бібліятэк, цэнтралізаванай сістэмы публічных бібліятэк горада Мінска.

Конкурс праводзіцца штогод сярод публічных бібліятэк краіны ў два этапы (абласны і рэспубліканскі). Сёлета ў конкурсе прынялі ўдзел 34 публічныя бібліятэкі: 15 цэнтральных і 19 бібліятэк-філіялаў, у тым ліку 2 дзіцячыя, 17 гарпасялковых і сельскіх.

Пераможцамі сталі 24 публічныя бібліятэкі ў чатырох намінацыях: “За падтрымку і развіццё чытання”, “За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем”, “За пошукавую і даследчую працу”, “За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы”. Пяць бібліятэк журы прадставіла да заахвочвання.

Бібліятэкі-пераможцы і 5 бібліятэк, прадстаўленых журы да заахвочвання, атрымаюць узнагароды адпаведна з загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь № 97 ад 22 чэрвеня 2021 года “Аб выніках XXIX рэспубліканскага конкурсу “Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры” — дыпломы першай, другой, трэцяй ступені і грашовыя прэміі ў памерах 50, 40 і 30 базавых велічынь адпаведна. Бібліятэкі, прадстаўленыя да заахвочвання, атрымаюць грашовыя прэміі ў памеры 10 базавых велічынь.

Год ад года бібліятэкі дэманструюць усё больш высокі інфарматыўны і афарміцельскі ўзровень, культуру падачы матэрыялаў з мультымедыйнымі дадаткамі, каляровымі фотаздымкамі, яркімі буклетамі, малюнкамі, вершамі, рукапіснымі водгукамі чытачоў. Значная колькасць распрацовак выканана як у тэкставым, так і ў электронным выглядзе, што сведчыць аб больш упэўненым выкарыстанні новых тэхналогій, у тым ліку і ў сельскіх установах.

САБАКА ДАПАМАГАЕ І КНІГА Ў КВАДРАЦЕ

На разгляд журы ў **намінацыю “За падтрымку і развіццё чытання”** бібліятэкамі была даслана найбольшая колькасць работ — 10.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых устаноў заняла *Цэнтральная гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 13 Брэсцкай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Аляксандра Пушкіна* за стварэнне адзінай чытацкай прасторы ў межах сацыяльнага праекта па каністэрапіі “Открой себя другу”. Гэта адзін з унікальных праектаў у Рэспубліцы Беларусь, які прыцягвае сабак да папулярызацыі чытання і кнігі. Ён накіраваны на стабілізацыю псіхічнага і эмацыянальнага стану пры дапамозе метадаў бібліяі- і каністэрапіі ва ўзаемадзеянні бібліятэкі, школы, сям’і і іншых інстытутаў. У рамках праекта арганізаваны незвычайны гурток развіваючага чытання “Сачытайка” для дзяцей старэйшага школьнага ўзросту, малодшых школьнікаў і іх бацькоў. Чытанне ўслых сабаку з’яўляецца ключавым элементам заняткаў у гуртку. Практычнай значнасцю работы стала выданне кнігі з QR-кодамі па асноўных этапах рэалізацыі праекта і памяткамі па культуры зносін з сабакамі.

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у гэтай намінацыі стала *Азеричынская бібліятэка сямейнага чытання Рэчыцкай раённай сеткі бібліятэк* за адраджэнне традыцый сямейнага чытання і цікавасці да кнігі, стварэнне спрыяльных умоў для змястоўнага правядзення вольнага часу ўсёй сям’ёй, рэалізацыю шэрагу праектаў. У віртуальнай прасторы ўстанова прадстаўлена праз уласны Web-блог “Букняша2”.

На другое месца вылучана *Цэнтральная гарадская бібліятэка імя Карла Маркса цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк горада Магілёва* за паспяховую рэалізацыю праграмна-праектнай дзейнасці. EVENT-праект “КНІГА2” — адзін з найбольш яркіх праектаў бібліятэкі, накіраваных на прыцягненне ўвагі да чытання з выкарыстаннем сучасных інфармацыйных тэхналогій. Кніга, прапанаваная не бібліятэкарам, а вядомым чалавекам у прамым эфіры Instagram-акаўнта, набывае двайное значэнне і становіцца “кнігай у квадраце”. Не менш цікавы інфармацыйна-выставачны праект “Кніжны подыум” раскрыў багаты кніжны фонд бібліятэкі з выкарыстаннем медыйных рэсурсаў і іншых нестандартных формаў прасоўвання кнігі.

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк лепшай прызнана *Краснаслабодская гарпасялковая экалагічная бібліятэка-філіял № 5 Салігорскай раённай цэнтральнай бібліятэкі* за прывіццё любові да кнігі і падтрымку чытання, фарміраванне цікавасці да беларускай мовы, мастацкай кнігі, папулярызацыю беларускай культуры сярод дзяцей дашкольнага ўзросту праз рэалізацыю праекта “Чароўная скарбонка”. Праект прадугледжвае выкарыстанне інтэрактыўных форм работы, дыдактычнага матэрыялу, тэатралізаваных пастановак, што ўзнімае прэстыж бібліятэкі ў мясцовым грамадстве, стварае добры аўтарытэт сярод бацькоў і педагогаў, спрыяе падрыхтоўцы дзяцей для паспяховага навучання ў пачатковых класах.

Дыплом трэцяй ступені ў намінацыі “За падтрымку і развіццё чытання” прысуджаны *Лідскай раённай бібліятэцы імя Янкі Купалы* за стварэнне асабістага бібліятэчнага відэаканала, які з’яўляецца эфектыўным інструментам для прасоўвання бібліятэчных паслуг, дэманстрацыі дасягненняў бібліятэкі. Ён не толькі паляпшае імідж установы, але актыўна прыцягвае карыстальнікаў да кніг і чытання. YouTube-канал Лідскай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы — гэта стартавая пляцоўка для стварэння віртуальных праектаў. Так, у мінулым годзе ў інтэрнэт-асяроддзі бібліятэкарамі было рэалізавана 15 творчых праектаў, у рамках якіх падрыхтавана больш за 100 відэа- і інтэрактыўных заданняў. Для сістэматызацыі віртуальных праектаў створаны віртуальны гід па інтэрнэт-рэсурсах бібліятэкі.

Лепшай сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, стала *Раснянская бібліятэка-філіял Дрыбінская бібліятэчнай сеткі* за распрацоўку і ўкараненне інавацыйных форм работы ў галіне экалагічнага выхавання. Візітоўкай установы з’яўляецца экалагічны пакой “Зялёная краіна”. У рамках мэтавай праграмы “Кожны ў адказе за жыццё на планеце” былі распрацаваны і паспяхова рэалізаваны праекты “Багацце зямлі Дрыбінскай” (2018) і “Зялёная карта Дрыбінскага раёна” (2019 — 2020). Падчас рэалізацыі праектаў упершыню была здзейснена спроба акумуляцыі інфармацыі і выдання ўнікальнай кнігі пра адметныя прыродныя мясціны Дрыбінскай зямлі, якія ахоўваюцца дзяржавай; складзена інтэрактыўная карта помнікаў прыроды Дрыбіншчыны “Зялёная карта Дрыбінскага раёна” на інтэрнэт-сэрвісе Google Карты.

ПАЗБАВІЦЦА САЦЫЯЛЬНАЙ ІЗАЛЯВАНАСЦІ

У **намінацыю “За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем”** было прадстаўлена 8 работ.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк журы прысудзіла *гарадской дзіцячай бібліятэцы філіялу Смаргонскай раённай бібліятэкі* за пераадоленне сацыяльнай ізаляванасці дзяцей з інвалідасцю шляхам стварэння ў бібліятэцы лялечнага тэатра “Праменьчык” у рэжыме анлайн. Лялечны тэатр утвораны ў межах рэалізацыі ініцыятывы “Арганізацыя асяроддзя для пераадолення сацыяльнай ізаляванасці дзяцей з інваліднасцю” ў рамках праекта “Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь”, які рэалізуецца Праграмай развіцця ААН (ПРААН). Дзякуючы атрыманаму гранту на праект, у філіяле праведзены рамонт памяшкання для выступленняў лялечнага тэатра, закуплены новыя пальчаткавыя лялькі, набыта патрэбнае абсталяванне.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, лепшай прызнана *Браніслаўская сельская бібліятэка Жыткавіцкай раённай сеткі бібліятэк* за сацыяльнае партнёрства са школай у выхаваўчай рабоце з падрастаючым пакаленнем. Так, сумесна са школай, на базе якой функцыянуе бібліятэка, распрацаваны і рэалізаваны праект “Бібліятэка і школа — тэрыторыя чытання”. У рамках праекта праводзяцца квэст-гульні, літаратурна-гульнёвыя праграмы, віктарыны, конкурсы і гэтак далей. Цікавасць да вывучэння культуры і традыцый Беларусі, да беларускай народнай творчасці фарміруюць, створаныя на базе бібліятэкі гурткі.

Другую прэмію сярод гарадскіх і раённых бібліятэк атрымала *Цэнтральная раённая бібліятэка Віцебскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы* за рэалізацыю грамадзянска-патрыятычнага праекта “Жывая памяць пакаленняў...” Дзякуючы карпатлівай працы бібліятэчных работнікаў былі знойдзены копіі дакументаў ваеннага часу: прадстаўленні да ўзнагарод, загады аб узнагароджванні, у сямейных архівах — франтавыя лісты, капсулы з асабістымі данымі, прадметы ваеннага часу (рамяні, гадзіннікі і іншыя рэчы). Вынікам праекта стала з’яўленне эфектнай кнігі-банера, якая спалучыла інфармацыйны і графічны блокі, згрупаваныя па раздзелах. Сёння распрацаваныя матэрыялы актыўна выкарыстоўваюцца ў выхаваўчай рабоце з дзецьмі і падлеткамі, на шматлікіх раённых мерапрыемствах, прысвечаных гісторыі краю.

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк адзначана *бібліятэка аграгарадка Любішчына Чэрвеньскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.* Больш за дзесяць гадоў пры ўстанове дзейнічае аматарскае аб’яднанне для дзяцей і падлеткаў “Рукзачок”, работа якога носіць пазнаваўчы, забаўляльны і творчы характар, садзейнічае выхаванню, адукацыі і развіццю творчых здольнасцяў, прасоўванню кнігі і чытання ў дзіцячым асяроддзі. Пры клубе працуе літаратурна-творчая пляцоўка “Майстэрня Цюбіка”, дзе дзеці асвойваюць розныя віды творчасці і рамёстваў — роспіс, лепка з пластыліну і цеста, стварэнне ўнікальных падарункавых паштовак, букетаў з цукерак, магнітаў, вітражоў. У рамках дадатковай падпраграмы клуба “Рюкзачок” дзейнічае Школа бяспекі, на занятках якой дзеці ў цікавай форме навучаюцца асновам бяспекі паўсядзённага жыцця і ў надзвычайных сітуацыях.

Трэцяе месца ў намінацыі “За падтрымку і развіццё чытання” заняў *філіял гарадской бібліятэкі № 7 Мазырскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Аляксандра Пушкіна* за распрацоўку і рэалізацыю доўгатэрміновага праекта “Вялікая гульня”. Адметнай асаблівасцю праекта з’яўляецца тэрыторыя арганізацыі дасуга — інтэлектуальнае, творчае бібліятэчнае асяроддзе, якое развівае, свабоднае ад павучальнасці. Спецыяльна для дзяцей і падлеткаў створана асобная зона для чытання і зносін, малявання, настольных гульняў. У рамках праекта прадугледжваецца правядзенне масавых мерапрыемстваў з гульнёвымі формамі работы: квэсты, ваенна-патрыятычныя квізы, літаратурна-гульнёвыя гадзіны, бібліядаследаванні, забаўляльна-пазнаваўчыя праграмы і іншае.

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк на трэцяе месца вылучана *Мышкавіцкая сельская бібліятэка-філіял № 1 сеткі бібліятэк Кіраўскага раёна* за мэтанакіраваную працу па выхаванні патрыятызму ў дзяцей і падлеткаў. Бібліятэкары сабралі багаты гістарычны матэрыял пра вёску Мышкавічы, яе культуру і традыцыі, сістэматызавалі яго і прадставілі ў выглядзе інфармацыйнага рэсурсу “Буслі ны край, мой вырай і прытулак”. Краязнаўчы альбом, зроблены ў тэхніцы скрапбукінг, утрымлівае тэкставую і графічную інфармацыю, якая прадстаўлена ў некалькіх раздзелах. Інфармацыйныя матэрыялы ў альбоме дапаўняюць тэматычныя відэаролікі, якія знаёмяць з мінулым і сучасным аграгарадка Мышкавічы, яго славутасцямі.

ПЕРАЗАГРУЗКА

У намінацыю **“За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы”**, як і ў папярэднюю намінацыю, было даслана 8 работ.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прысуджана *Цэнтральнай раённай бібліятэцы Светлагорскай раённай сеткі бібліятэк* за рэалізацыю маштабнага сеткавага інтэрнэт-праекта “Бібліятэка. Перазагрузка”, у межах якога бібліятэкары распавядалі анлайн ад новых кнігах, чыталі дзецям казкі, праводзілі займальныя майстар-класы, анлайн-агляды віртуальных выстаў, музейныя відэарэпартажы, гучныя чытанні і гэтак далей. Карыстальнікам патрэбна было толькі самастойна зайсці ў сацыяльныя сеткі (“Вконтакте”, “Одноклассники”, Instagram), глядзець і слухаць. Да ўдзелу ў праекце былі прыцягнуты ўсе гарадскія бібліятэкі. З гэтай нагоды распрацаваны лагатып Светлагорскай раённай сеткі бібліятэк і бібліякарта з указаннем месцаў знаходжання бібліятэк у горадзе. Бібліякарты былі размешчаны пры ўваходзе ў гарадскія бібліятэкі.

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк ў гэтай намінацыі стала *Лясянская бібліятэка-музей цэнтралізаванай сеткі публічных бібліятэк Слаўгарадскага раёна* за распрацоўку і рэалізацыю інавацыйных праектаў, накіраваных на павышэнне сацыяльнага статусу ўстановы, фарміраванне пазітыўнага іміджу рэгіёна, прыцягненне турыстаў і інвестыцый, росту цікавасці да гісторыі роднага краю. Адзін з самых адметных — ініцыятыва “Музей пад адкрытым небам” у рамках міжнароднага супрацоўніцтва “Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь”. У выніку рэалізацыі праекта непасрэдна на месцы бітвы ў вёсцы Лясная створаны музей пад адкрытым небам, які стаў своеасаблівым праця-

індывідуальнасць, патэнцыял

Каністэрапія ў філіяле № 13 Брэсцкай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Аляксандра Пушкіна. Імя сабакі — Берта.

гам экспазіцыі, афармленай у бібліятэцы-музеі.

Дыпломам другой ступені ў гэтай намінацыі адзначана *Навагрудская раённая бібліятэка* за рэалізаваны праект "Рэтра-фота-атэльє", на прасоўванне якога бібліятэка атрымала Грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне навукі, адукацыі, аховы здароўя і культуры. На заказ былі пашыты касцюмы, набыты аксесуары, для інтэр'ера закуплена спецыяльная мэбля. Утульнасць пакою надалі прыгожыя шпалеры "пад даўніну" і дэкор акна, на сценах — фотаздымкі старога Навагрудка. Галоўная адметнасць рэтра-фотаатэльє — фотабокс з імгненным фота. У фотастудыі, стылізаванай пад даўніну, можна пераапрануцца, сфатаграфавацца і імгненна атрымаць фотаздымкі.

Другая прэмія сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк прысуджана *бібліятэцы-філіялу аграгарадка Суботнікі Іўеўскай раённай бібліятэкі Гродзенскай вобласці* за краязнаўчы электронны даведнік "Жамыслаўль". Інфармацыйны рэсурс створаны для захавання і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны малой радзімы, павышэння турыстычнага патэнцыялу рэгіёна, забеспячэння даступнасці інфармацыі для аддаленых карыстальнікаў, пашырэння чытацкай аўдыторыі бібліятэкі. Жамыслаўль — гэта помнік сядзібна-паркавай архітэктуры XVIII — XIX стагоддзяў, які ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. Работа над інфармацыйным рэсурсам працягваецца да сённяшні дзень. Доступ да рэсурсу забяспечаны на сайце Іўеўскай раённай бібліятэкі.

Ляхавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Янкі Купалы спецыялізуецца на вывучэнні мясцовай тапанімікі. Чытачы разам з бібліятэкарамі падчас экспедыцыі па даследаванні мовы роднай зямлі.

Трэцяе месца ў намінацыі "За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы" журы прысудзіла *Шклоўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы цэнтралізаванай бібліятэчнай сеткі Шклоўскага раёна* за дасягнутыя поспехі экалагічнай асветы і экалагічнага інфармавання, вывучэння і захавання прыроднай спадчыны краю. Больш за дваццаць пяць гадоў пры ўстанове працуе аматарскі калектыў "Фларыяда", удзельнікі якога захапляюцца пакаёвымі і садовымі кветкамі, пашыраюць веды і практычныя навыкі па іх вырошчванні і догляду.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці на трэцюю прэмію журы вылучыла *Лоеўскую цэнтральную раённую бібліятэку* за стварэнне і паспяховую дзейнасць "Лоеўскай батлейкі". Яна з'явілася ў бібліятэцы дзякуючы праекту "Ад партнёрства мясцовых музеяў да шырокага трансгранічнага культурнага супрацоўніцтва". Заняткі для дзяцей ў батлеечным тэатры развіваюць фантазію, памяць, мысленне, артыстычныя здольнасці, маторыку рук і пальцаў дзіцяці, рухальную актыўнасць. Рабяты, якія займаюцца батлеечным тэатрам, сталі лепш чытаць, размаўляць на беларускай мове, у некаторых палепшылася паспяховасць у школе. Гледачамі інтэрмедый выступаюць чытачы, дзеці, якія наведваюць школьныя лагеры, выхаванцы дзіцячых садкоў і іншыя.

МОВА РОДНАЙ ЗЯМЛІ

У намінацыі **"За пошукавую і даследчую працу"** на разгляд журы было прадстаўлена 8 работ.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк заняла *Глыбоцкая цэнтральная раённая бібліятэка Глыбоцкай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы* за пошукавую і даследчую працу па вывучэнні гісторыі ўзнікнення і станаўлення перыядычнага друку на тэрыторыі Глыбоцкага краю і стварэнне даведачнага выдання "Перыядычны друк Глыбоччыны (1924 — 2020)". Гэта першае асобнае выданне, якое асвятляе гісторыю ўзнікнення перыядычнага друку на Глыбоччыне, дае дакладную і поўную бібліяграфічную інфармацыю пра мясцовыя газеты і часопісы, удакладняе інфармацыю аб персаналіях, звязаных з выдавецкай дзейнасцю. У дапаможніку ахарактарызавана 24 выданні.

Выданне Глыбоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі "Перыядычны друк Глыбоччыны".

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк стала *Завалочыцкая сельская бібліятэка сеткі публічных бібліятэк Глускага раёна* за пошукавую і даследчую працу па вывучэнні роднага краю і стварэнні інфармацыйнага рэсурсу "Завалочыцкі край". У аснову пошукавай працы была пакладзена мэтавая праграма "Мой родны кут — мой клопат і мой лёс" (2018 — 2020), у рамках якой бібліятэкарамі сабрана вялікая колькасць матэрыялаў з гісторыі вёскі Завалочыцы, у тым ліку пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. На падставе сабранага матэрыялу створаны электронны краязнаўчы рэсурс "Завалочыцкі край", які прадстаўляе ўнікальныя звесткі з гісторыі вёскі, цікавыя факты аб знакамітых земляках, гістарычныя матэрыялы аб ваенных падзеях на тэрыторыі краю, вершы, легенды, паданні.

На другое месца ў гэтай намінацыі вылучана *Ляхавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Янкі Купалы Ляхавіцкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы* за плённую пошукавую і даследчую працу па вывучэнні, сістэматызацыі і захаванні тапанімічных матэрыялаў аб раёне; стварэнне рэсурсу "Мова маёй зямлі: тапанімічны слоўнік Ляхавіччыны". Выданне змяшчае навукова-папулярныя эцюды пра паходжанне назваў геаграфічных аб'ектаў Ляхавіцкага раёна. Пры назвах падаюцца геаграфічныя, гістарычныя, этнаграфічныя звесткі, народныя легенды і паданні, старажытныя і сучасныя іх варыянты, меркаванні наконт паходжання. Выданне "Мова маёй зямлі: тапанімічны слоўнік Ляхавіччыны" прадстаўлена на сайце дзяржаўнай установы культуры "Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма".

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк лепшай прызнана *Квасоўская сельская бібліятэка — філіял Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра* за распрацаваны электронны краязнаўчы рэсурс "Гартаючы старонкі гісторыі Квасоўкі", які ўключае інфармацыйныя матэрыялы, фотаматэрыялы, фактаграфічныя і бібліяграфічныя звесткі аб вёсцы. Падчас распрацоўкі і стварэння рэсурсу праводзіліся гутаркі з жыхарамі, запісваліся іх успамны, вывучаліся архіўныя матэрыялы. Рэсурс прадстаўлены на сайце інфармацыйна-бібліятэчнага аддзела Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра і актыўна выкарыстоўваецца пры падрыхтоўцы і правядзенні разнастайных мерапрыемстваў як у бібліятэцы, так і ў іншых установах і арганізацыях.

Дыплом трэцяй ступені ў намінацыі "За пошукавую і даследчую працу" прысуджаны *Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэцы імя Андрэя Макаёнка цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы горада Гродна* за інфармацыйны рэсурс "Аляксей Карпюк. Музей жыцця і творчасці", які створаны з нагоды 100-годдзя з дня нараджэння пісьменніка і грамадзяніна Гарадзеншчыны. Музей Аляксея Карпюка — гэта комплекс электронных дакументаў рознага фармату, персанальная база даных з фактаграфічным, поўнатэкставым і бібліяграфічным напаўненнем. Ён змяшчае шэсць тэматычных залаў, якія знаёмяць наведвальнікаў з падрабязнай біяграфіяй, успамінамі сяброў, знаёмых, родных, водгукамі і рэцэнзіямі на творчасць, прысвячэннямі паэтаў і мастакоў, фотаздымкамі, відэаролікамі, поўнай бібліяграфіяй выданняў пісьменніка, кніг і публікацый пра яго асобу і творчасць.

Лепшай сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, стала *Ліноўская сельская бібліятэка Пружанскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы* за мэтанакіраваную пошукавую дзейнасць па даследаванні матэрыялаў пра тэрыторыю Ліноўскага сельскага Савета ў час Вялікай Айчыннай вайны і стварэнне ўнікальнага выдання "Памяць павінна жыць вечна". На працягу многіх гадоў бібліятэкары па крупіцах збіралі матэрыялы аб падзеях ваеннага ліхалецця, якія потым сістэматызавалі і ўвасобілі ў выданне. У ім распавядаецца аб часе акупацыі на тэрыторыі Ліноўскага сельскага Савета, вызваленні тэрыторыі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, аднавяскоўцах, што загінулі і прапалі без звестак у гады Вялікай Айчыннай вайны; прыводзяцца ўспаміны ветэранаў і іх родных, спісы ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

■■■

Конкурс "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры" яшчэ раз сцвярджае выключнасць ды індывідуальнасць, высокае прафесійнае і творчае майстэрства бібліятэчных спецыялістаў нашай краіны. Яго ўдзельнікі выразна адлюстравалі, як рэалізуецца бібліятэчны патэнцыял у справе адраджэння нацыянальнай культуры, гісторыі, літаратуры, мовы, фальклорна-этнаграфічнай спадчыны; зноў здзівілі, захапілі і зацікавілі членаў журы; падзяліліся сваімі перспектыўнымі напрацоўкамі і набылі каштоўны прафесійны вопыт, які спатрэбіцца ў рабоце і пры падрыхтоўцы матэрыялаў да наступнага, юбілейнага XXX рэспубліканскага конкурсу.

Вольга КАКШЫНСКАЯ,
галоўны бібліятэкар навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

КУЛЬТУРА
WWW.KIMPRESS.BY
№ 28 / 10 ЛІПЕНЯ 2021 Г.

След гераічных канспіратараў

Загадкі і згадкі аб мінскім падполлі

80-годдзе з дня нападу нацысцкай Германіі на Савецкі Саюз — гэта яшчэ адна нагода ўзгадаць не толькі пра трагедыю першых дзён вайны на беларускай зямлі, але і пра пачатак гераічнага супраціву акупантам, у які адразу ж уключыліся шматлікія нашыя суайчыннікі, незалежна ад узросту, нацыянальнасці альбо роду заняткаў. Адной з найбольш вядомых старонак барацьбы супраць гітлераўцаў у Беларусі была дзейнасць мінскага патрыятычнага падполля. Вядомых — але ці добра знаёмых? Наколькі добра мы ведаем гісторыю падполля, і як можна зрабіць памяць аб яго героях больш заўважнай у гарадскім асяроддзі?

Антон РУДАК

Здавалася б, аб мінскіх падпольшчыках даўно напісана мноства навуковых і мастацкіх кніг, у розныя часы на гэтую тэму знятыя некалькі фільмаў і нават тэлесерыялаў... Але рэчаіснасць паказвае, што нават тыя факты, якія падаюцца відавочнымі, могуць, насамрэч, заставацца загадкамі.

РАЗВІЦЦЁ, ПЕРАРВАНАЕ БОМБАМІ

У чэрвені 1941 насельніцтва Мінска налічвала каля дзвюхсот сямідзесяці тысяч чалавек, а тэрыторыя горада, за рэдкімі выключэннямі, змяшчалася прыкладна ў межах сучаснага другога транспартнага кальца. На ўскраінах пераважала драўляная аднапавярховая забудова, а ў цэнтры нават сярод мураваных будынкаў большасць складалі дамы, пабудаваныя яшчэ да рэвалюцыі. Тым не менш, цягам 1930-х гадоў паступова разгортвалася і новае будаўніцтва, у горадзе з'яўляліся грунтоўныя грамадскія будынкі і цэлыя комплексы, такія як Дом ураду, тэатр оперы і балета, Дом Чырвонай Арміі (сённяшні Дом афіцэраў), універсітэцкі і клінічны гарадкі. На ўскраінах будаваліся пад жыллё рабочыя пасёлкі з тыпавых двухпавярховых драўляных дамоў.

Развіццё і рост горада былі гвалтоўна спыненыя нападам акупантаў. Ужо на другі дзень вайны на беларускую сталіцу ўпалі першыя бомбы. Назаўтра, 24 чэрвеня, адбылася яшчэ больш маштабная бамбардзіроўка ўсяго гарадскога цэнтра, якая зрабіла гэты дзень адным з найстрашнейшых у гісторыі Мінска — забудова вуліц Савецкай (сённяшняга праспекта Незалежнасці) і Леніна была знішчаная амаль цалкам. Таксама ад пажараў, выкліканых запальвальнымі бомбамі, цалкам згарэлі велізарныя кварталы драўлянай забудовы на левым беразе Свіслачы, аж да Камароўкі.

Авіяналёты працягваліся і ў наступныя дні, пакуль 28 чэрвеня, на сёмы дзень вайны, у Мінск не ўвайшлі нямецкія войскі. Такі імклівы захоп беларускай сталіцы зрабіўся шокам для ўсіх жыхароў Савецкага Саюза. Які адчай адчувалі ў гэты момант самі мінчукі — увогуле цяжка ўявіць. Ніхто з іх не ведаў, што акупанты прыйшлі сюды на доўгія тысяча сто дзён. Але кожны з гэтых дзён увайшоў і ў летапіс змагання супраць ворагаў.

СПРАВЫ СЯМЕЙНЫЯ

Першыя падпольныя групы пачалі ўзнікаць стыхійна, без якой-кольвек каманды зверху — людзі, выхаваныя ў патрыятычным духу, неўзабаве ачомаліся ад шоку, выкліканага паразамі першых дзён вайны, і пачалі шукаць магчымасць хоць нечым дапамагчы ў справе змагання супраць захопнікаў. Часам гэтыя групы, на жаль, існавалі так нядоўга, што нават не паспявалі далучыцца да агульнай структуры падполля. У гэтым сэнсе паказальнай з'яўляецца гісторыя групы, якая дзейнічала ў лазарэце, размешчаным у першыя дні пасля захопу горада ў будынку, дзе сёння — галоўны корпус Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта (пасля вайны ён быў істотна перабудаваны).

Група гэтая ўзнікла, можна сказаць, па прынцыпе сваяцтва — у яе ўвайшлі супрацоўніца 3-га гарадскога шпіталя Вольга Шчарбацэвіч з 14-гадовым сынам Уладленам (Валодзем), два яе браты і сястра з мужам, а таксама некалькі іх знаёмых. На свой страх і рызыку яны арганізоўвалі для параненых савецкіх ваеннапалонных уцёкі з нямецкага лазарэта, дапамагаючы ім перайсці на нелегальнае становішча і далучыцца да партызан — такім чынам былі перапраўленыя ў лясы каля паўсотні чалавек.

Вольга і Уладлен Шчарбацэвічы.

Іван Кавалёў.

НАПАМІН ПРА ГЕРОЙСТВА, ЗДРАДУ І ПОМСТУ

На жаль, ужо ўвосень група была выкрытая, дзякуючы здрадзе аднаго з уратаваных ваеннапалонных, Барыса Рудзянкі, які пагадзіўся на супрацоўніцтва з нямецкай вайсковай контрразведкай — абверам. 26 кастрычніка ўдзельнікаў групы павесілі на гарадскіх вуліцах — гэта было першае публічнае пакаранне смерцю ў акупаваным Мінску. Што тычыцца Барыса Рудзянкі, ён працягваў сваю чорную справу, прабраўшыся ў агульнагарадскія падпольныя структуры, і далей выдаваў патрыётаў у рукі нацыстаў. Справядлівае пакаранне напаткала яго толькі пасля вайны — ён быў асуджаны і ў 1951 годзе расстраляны.

Месцы, дзе былі пакараныя смерцю ўдзельнікі групы Шчарбацэвічаў, сёння належным чынам ушанаваныя — памятныя знакі ўсталяваныя на вуліцы Кастрычніцкай і ў Аляксандраўскім скверы. Але, як ні дзіўна, няма ніякай памятнай шыльды на доме, дзе жылі Вольга і Уладлен Шчарбацэвічы, па праспекце Незалежнасці, 27А. А ўсталяваць такі знак было б варта, бо менавіта з гэтым месцам звязаны адзін з найбольш адметных і трагічных эпізодаў у гісторыі падполля.

ХТО КАМАНДАВАЎ ПАДПОЛЬШЧЫКАМІ?

Падпольныя групы паступова ўзнікалі, пачынаючы з ліпеня 1941 года, па ўсім горадзе. Найчасцей ствараліся яны таксама па сямейных ці суседскіх сувязях, альбо сярод калег па працы, на самых розных прадпрыемствах. Агульная колькасць удзельнікаў падполля і датычных да яго дзейнасці, паводле апошніх звестак, ацэньваецца амаль у дзесяць тысяч чалавек. Спектр дзейнасці падпольшчыкаў быў надзвычай шырокі: акрамя дапамогі ваеннапалонным, розныя групы збіралі і перапраўлялі ў партызанскія атрады зброю і медыкаменты, праводзілі агітацыю сярод насельніцтва і збіралі разведданыя аб дзеяннях ворага, ладзілі акцыі сабатажу і дыверсіі, і нават удзельнічалі ў непасрэднай ліквідацыі гітлераўцаў ды іх прыслужнікаў. Усе ячэйкі былі аб'яднаныя пад кіраўніцтвам пяці падпольных раённых камітэтаў, якія, у сваю чаргу, падпарадкоўваліся падпольнаму гаркаму.

Хто ж стаяў на чале мінскага падполля? Як ні парадаксальна, для шырокіх мас гэтае пытанне і сёння застаецца таямніцай. Часта размаўляючы з людзьмі аб гісторыі падполля, я заўжды задаю адно і тое ж пытанне — ці ведаюць мае суразмоўцы, хто быў кіраўніком мінскіх падпольшчыкаў? Адказ, на жаль, зазвычай упэўнены, але няправільны. Рэч у тым, што доўгія гады лідарам мінскага падполля паводле афіцыйнай версіі лічыўся Ісай Казінец. Ён сапраўды ўваходзіў у кіраўніцтва гаркама і адыгрываў у дзейнасці падполля надзвычай важную ролю, але ў рэчаіснасці на чале ўсіх падпольных структур у горадзе ўсё-ткі стаяў іншы чалавек, імя якога дагэтуль застаецца добра вядомым толькі для спецыялістаў. Як жа так выйшла?

Ужо ў першыя дні вайны партыйнае кіраўніцтва Беларусі прыняло рашэнне аб неабходнасці стварэння на акупаванай тэрыторыі падпольных структур, якія сталі б на чале змагання супраць ворага. Адным з тых, каго пакінулі для гэтай мэты за лініяй фронту, быў Іван Кавалёў — да вайны ён займаў пасаду сакратара райкама партыі ў Заслаўі. Улетку 1941 года менавіта гэты чалавек з'явіўся ў Мінску і аб'яднаў пад сваім кіраўніцтвам падпольныя структуры ў горадзе, маючы на гэта ўсе паўнамоцтвы. Падпольны гаркам партыі дзейнічаў на чале з Кавалёвым ажно да восені 1942 года, калі ў выніку чарговага буйнога правалу яго кіраўнік быў схоплены нацысцкімі карнымі органамі.

"ПОСПЕХІ" ПАКЛЁПНІКАЎ

Тут і пачалася сумная гісторыя шматгадовага забыцця, на якое быў асуджаны лідар падпольшчыкаў. Нацысты зладзілі сапраўды подлую правакацыю, надоўга абылгаўшы яго імя і скампраметаваўшы ўсіх, хто з ім супрацоўнічаў. Адразу пасля таго, як Кавалёў быў схоплены, у пранямецкай прэсе, якая выходзіла ў акупаваным Мінску, былі апублікаваныя звесткі, нібыта кіраўнік гарадскога падполля пайшоў на супрацоўніцтва з гітлераўцамі, і выдаў усіх сваіх паплечнікаў. Каб замацаваць эфект, сцвярджалася, што ён выступае перад працоўнымі і каецца за сваю барацьбу.

Тыя падпольшчыкі, якія засталіся на волі, не маглі даць веры такім "навінам", але, як ні парадаксальна, гэтай хлусні, на жаль, паверылі на іншым баку фронту. Цэнтральнае камандаванне партызанскага руху, якое знаходзілася ў Маскве, распарадзілася лічыць Івана Кавалёва здраднікам, прызнала, што падпольныя структуры, якія ён узначальваў, нібыта былі створаныя немцамі з мэтай правакацыі...

ВЯРТАННЕ ДОБРАГА ІМЕНІ

Гэтая памылка дорага каштавала ўдзельнікам падполля, як падчас вайны, так і пасля яе заканчэння. Толькі ў 1959 годзе больш за сотню колішніх падпольшчыкаў былі рэабілітаваныя і пазбаўленыя кляйма здраднікаў — але нават тады Івана Кавалёва працягвалі лічыць правакатарам. І ажно яшчэ праз сорак гадоў, у 1989-ым, адкрыліся сапраўдныя акалічнасці яго арышту і гібелі, і толькі тады кіраўніку падполля было вернутае добрае імя. Насамрэч, ён быў забіты гітлераўцамі пасля паўгода допытаў і катаванняў, так і не выдаўшы нікога з паплечнікаў.

Так ці інакш, версія аб лідарстве Казінца і здрадзе Кавалёва надоўга ўмацавалася ў масавай свядомасці. Магчыма, таму і сёння імя апошняга не на слыху — хаця, між іншым, іменем Івана Кавалёва была нават названая вуліца ў Мінску, у мікрараёне Сухарава. Вось толькі сёння, калі ў гэтым раёне адбываецца інтэнсіўнае будаўніцтва новых шматпавярховых дамоў, старая драўляная забудова вуліцы паступова знікае, а ад яе трасы засталося ўжо не больш за паўкіламетра. Ці не нагода гэта зноў здумацца аб ушанаванні памяці чалавека, які ўзначальваў супраціў гітлераўцам у беларускай сталіцы? Адрасы, па якіх ён жыў у Мінску падчас акупацыі, таксама вядомыя — гэта дамы па вуліцы Хлебнай (сёння ёй вернутая гістарычная назва, Юр'ева-Завальная) і Савецкай, у самым цэнтры горада. Няблага было б і тут пабачыць нейкі напамін аб сапраўдным лідары падпольшчыкаў.

РУІНЫ-ПОМНІКІ

Разбурэнні, нанесеныя Мінску падчас вайны, былі настолькі моцнымі, што разглядалася нават магчымасць адбудовы сталіцы БССР на новым месцы — а руіны старога горада прапаноўвалася захаваць у якасці помніка, як напамін аб ліхалецці. Цяжка сказаць, ці быў гэты план удалым, але, так ці інакш, да яго рэалізацыі не дайшло. Таму сёння гарадское жыццё працягвае віраваць у тых самых лакацыях, дзе некалі змагаліся і гінулі героі-падпольшчыкі.

Спецыфіка дзейнасці гарадскога падполля палягала ў тым, што канспіратыўную работу заўжды было зручней весці на ўскраінах, забудаваных драўлянымі аднапавярховымі дамамі, у кварталах, дзе немцы рэдка паказваліся. Да таго ж, цэнтр горада быў моцна разбураны пажарамі і бамбардзіроўкамі яшчэ з першых дзён вайны. Сёння даследчыкам вядомыя некалькі соцень адрасоў канспіратыўных кватэр мінскага падполля, але, з вышэйзгаданых прычын, за рэдкімі выключэннямі амаль усе яны былі ў розныя часы зруйнаваныя, на іх месцы з'явіліся новыя гарадскія кварталы. Тым важней сёння захоўваць у сучасным горадзе рэдкія і каштоўныя сляды мясцін, звязаных з дзейнасцю і імёнамі тых, хто ў свой час кінуў выклік акупантам. Магчыма, некалі справа дойдзе і да з'яўлення ў сталіцы музея, прысвечанага гісторыі мінскага падполля.

К

Герб Чачотаў "Астоя".

Таямніцы Яна Чачота

ЧАСТКА II

Да 225-й гадавіны з дня нараджэння піянера беларускай фалькларыстыкі

(Працяг. Пачатак у "К", № 26, 2021)

Наш зямляк, філамат, паэт-рамантык і пачынальнік новай беларускай літаратуры… 17 ліпеня Беларусь адзначыць 225-ю гадавіну нараджэння славутага наваградца Яна Чачота. Сёння наш расповед пра род Чачотаў, сям'ю, дзіцячыя і студэнцкія гады класіка.

Зміцер ЮРКЕВІЧ

Філаматы і філарэты (мал. 1899).

АДКУЛЬ ІХ КАРАНІ?

У дваранскіх справах Данілевічаў-Чачотаў (герб "Астоя") і Дахноўскіх-Гаціскіх (герб "Рох III") сцвярджаецца, што абодва гэтыя роды перасяліліся ў Наваградскае ваяводства са Смаленшчыны. Памежныя з Маскоўкай дзяржавай землі ВКЛ былі не самымі спакойнымі. А потым, у выніку бясконцых войнаў, паводле "Дэвулінскага перамір'я" (1667 г.) значная частка Смаленскага ваяводства ўвогуле была страчана. Таму тыя, хто не жадаў станавіцца падданым маскоўскіх цароў, перабіраліся на заходнюю тэрыторыю ВКЛ.

З цягам часу дрэвы родаў Чачотаў і Гаціскіх разрасліся і не раз перапляталіся сваімі галінамі. Чарговае такое перапляценне адбылося 7 верасня 1794 года. У Стваловіцкім касцёле святога Яна Хрысціцеля (цяпер царква Аляксандра Неўскага, аграгарадок Сталовічы) сталі на шлюбны кабераць Тадэвуш Чачот і дачка наваградскага ротмістра Антона Гаціскага Клара. Пасля шлюбу, па ўсей верагоднасці, маладыя адправіліся ў фальварак Малюшыцы, які арандаваў Тадэвуш Чачот. Увогуле, адначасова і побач існавала тры фальваркі Малюшыцы — два з іх належалі татарскаму роду Уланаў, а трэці, як арэндная жытло, увесь час пераходзіў з рук у рукі. За гэтым фальваркам у 1795 — 1796 гадах лічыўся 51 падданы (19 мужчын і 32 жанчыны). Першанец у гэтай сям'і нарадзіўся 17 ліпеня (6 ліпеня па "старому стылю") 1796 года. Тут варта дадаць, што пакуль вярстаўся нумар удалося высветліць імя таго, хто першым адкрыў праўдзівую дату і месца нараджэння Яна Чачота. Гэта быў гісторык літаратуры, случчанін Леанард Падгорскі-Аколаў, які ў часопісе LECH (1937 год, № 3 — 4) прывёў метрычны запіс аб дапаўненні хросту Яна Чачота, які адрозніваецца ад знойдзенага намі толькі наяўнасцю пары сведкаў — Ігнат Чачот (брат Тадэвуша) і Разалія Гаціская (сястра Клары) і дадаткам "пасады" хростнай маці Яна, Ганны Шымкевіч (жонка аканома маёнтка ў Сервачы).

Дарэчы, не абыйдзем мы ўвагай і яшчэ аднаго даследчыка, які яшчэ ў 1986 годзе, у кнізе "От Нёмана к берегам Тихого океана", прывёў дату "17 ліпеня". Ім быў Валянцін Грыцкевіч, брат слыннага беларускага гісторыка Анатоля Грыцкевіча. "*Согласно документу, обнаруженному в деле "О дворянстве Чечотов" в Центральном государственном историческом архиве СССР в Ленинграде, он родился 17 июля 1796 года в застенке (шляхетском поселении) Малющицы...*"

ДЗЕ ПРАЙШЛІ ДЗІЦЯЧЫЯ ГАДЫ?

Пасля сканчэння тэрміна арэнды Малюшыцаў (сёння Малюшычы, Карэліцкі раён) бацькі Яна Чачота перабіраюцца ў маёнтак Новая Мыш (Баранавіцкі раён), дзе напачатку 1798 года ў іх нарадзілася дачка, якую 4 (15) лютага ахрысцілі імем Тэкля. Яе хроснымі сталі Ян Чачот (!) і Разалія Гаціская (сястра Клары). А 2 (14) красавіка 1801 года, там жа, у Новай Мышы, была ахрышчана Алаіза-Караліна. Як сцвярджае краязнаўца і чачотазнаўца Васіль Дубейка, у знойдзеным ім архіўным дакументе 1803 года сцвярджаецца, што бацька Яна — Тадэвуш Чачот становіцца аканомам часткі графства Новая Мыш (з 1777 года яно належала апошняму наваградскаму ваяводзе Юзафу Несялоўскаму). Прайшло яшчэ трошкі часу і ў аканома нарадзіўся сын Пётр-Павел, які быў ахрышчаны 17 (29) чэрвеня 1806 года ў маёнтку Баранавічы. Аб тым, што і надалей сувязь Яна Чачота з Новай Мышшу не парывалася, сведчыць хаця б той факт, што свае лісты да сяброў-філаматаў ён пачынаў са словаў "Ян з Мышы".

Касцёл і царква ў Новай Мышы (фота 1915 — 1918).



Дакумент аб арэндзе Тадэвушам Чачотам фальварка Малюшыцы (1795 — 1796).

І тут мы павінны згадаць яшчэ пра адну загадку, якая доўгія гады не давала і не дае спакою даследчыкам. У першай публікацыі, прысвечанай Яну Чачоту (аўтар Ян Прусіноўскі, 1860), з невядомай прычыны за месца нараджэння філамата быў абраны маёнтак Рэпіхаў (Рэпіхава, Ляхавіцкі раён). Памылку гэту ў 1937 годзе выправіў Леанард Падгорскі-Аколаў. Але Рэпіхаў усё роўна застаўся ў чачотазнаўстве, ужо як месца, "*дзе яго бацька працаваў аканомам і дзе прайшлі дзіцячыя гады Яна*". Праўда, аніводнага дакумента на карысць гэтага сцвярджэння дасюль прыведзена так і не было. Падзеныя ж вышэй архіўныя звесткі не пакідаюць Рэпіхава і гэтага шанца. Бо, як мы бачым, ад 1798 года сям'я жыла і "працавала" ў маёнтку Юзафа Несялоўскага (1728 — 1814).

ПЕРШЫЯ НАВУКІ І ЗНАЁМСТВА З АДАМАМ МІЦКЕВІЧАМ

Адносна года (1808-га ці 1809-га), калі Ян Чачот паступіў у наваградскі дамініканскі калегіум, падаецца, і да гэтага часу няма пэўнасці. Польскі даследчык з наваградскімі каранямі Анджэй Сыракомля-Булгак дэталёва разабраў пытанне і прыйшоў да высновы, што гэта адбылося ў 1808 годзе. А пазнаёміцца з Адамам Міцкевічам яны маглі толькі ў 1812 або 1813 гадах. Славуты ў будучыні географ, філамат Ігнат Дамейка так апісаў школьны перыяд жыцця сваіх сяброў: "*Два нашы студэнты навагрудскай школы з маленства ведалі і любілі наш літоўскі (то-бок беларускі) народ, палюбілі яго песні, пранікліся яго духам і паэзіяй...чаму, відаць, спрыяла і тое, што невялікае мястэчка Навагрудак мала адрозніваласа ад нашых вёсак і засценкаў. Школьнае жыццё было, па-сутнасці, сельскім. Сябры хадзілі па кірмашах, бывалі на сялянскіх вяселлях, дажынках і хаўтурах. Яшчэ ў школе бедная страха і народная песня распаліла ў грудзях сяброў першае паэтычнае натхненне...*" (пераклад і ўдакладненні Адама Мальдзіса).

Наваградак пачатку XIX стагоддзя — даўно ўжо не цэнтр ВКЛ, дзе 6 ліпеня 1253 года, як сцвярджаюць даследчыкі, каранаваўся першы і апошні кароль ВКЛ — Міндоўг. Гэта ўжо і не цэнтр велізарнага Наваградскага ваяводства, славутага сваімі постацямі — Рэйтанамі, Корсакамі, Радзівіламі. Жыло ў сталіцы павета Гродзенскай губерні, збольшага ў драўляных хатах і сядзібах, каля васьмі тысяч чалавек (у Лондане ў той час каля мільёна). Усіх забаў, сапраўды, — хадзіць па кірмашах-святах, а на вакацыях ездзіць па сябрах, чытаць і спрабаваць сілы ў паэзіі.

Але менавіта гэты перыяд сфарміраваў светапогляд Яна Чачота. Вырас ён у сям'і, у якой нястача была паўсядзённым фонам. Бацька яго, працуючы аканомам маёнтка, не асабліва дбаў пра сваю кішэню. Не быў ён і крывапійцам прыгоннага люду. А тое і гэтае былі ў тыя часы неад'емнымі рысамі гэтай "прафесіі". Адсюль пазней вырас і гнеўны прысуд Чачота "панам прыгнятальнікам" — балада "Узногі".

У 1815 годзе ў Яна Чачота і Адама Міцкевіча, вучняў 6 класа калегіума, з'явілася магчымасць паступіць у Віленскі ўніверсітэт. Але пашанцавала (заступніцтва ксяндза і ўніверсітэцкага выкладчыка Юзафа Міцкевіча) толькі Міцкевічу, які стаў у тым годзе студэнтам. Яну Чачоту, які быў больш чым на два гады старэйшым за сябра, прыйшлося адкласці паступленне да восені 1816 года.

ВІЛЕНСКАЯ ALMA MATER

"*Чачот Ян, сын Тадэвуша, 20 год, нарадзіўся ў губерніі Гродзенскай павет Навагрудзкі, парафіі варанчанскай*" — так запісана пра новага студэнта ў кнізе запісаў Віленскага ўніверсітэта за 1816 — 1817 вучэбныя гады. Правучыўся Ян Чачот гэты год на факультэце "навук маральных і палітычных", дзе выкладалі слынныя Ігнат Даніловіч, Яўхім Лелявель, Сымон Малеўскі і іншыя.

Але ў 1818 годзе з-за фінансавых складанасцяў Ян Чачот вымушаны быў пакінуць сцены ўніверсітэта і паступіць на працу "*ў Пракураторыю, не маючы аніводнай навуковай ступені і рангу*", дапамагаючы ў розных справах "*адвакату Турскаму*". Праца ў "Радзівілаўскай масе", адмысловай камісіі, якая займалася ўпарадкаваннем маёмасных спраў роду Радзівілаў, працягвалася сем гадоў. Пазней Ян Чачот згадваў, што яго бацька таксама працаваў у гэтай камісіі, толькі дзевяць гадоў. Што дазволіла недзе ў 1830 годзе аўдавеўшай маці Яна Чачота, дзякуючы заступніцтву дабрадзеяў, атрымаць пэўную пенсію, з якой яна і жыла, не маючы свайго маёнтка.

Цікава, што "Пракураторыя" была размешчана ў палацы Радзівілаў, які меў назву "Кардыналія". Там у тыя самыя часы жыла сям'я былых радзівілаўскіх тэатральных акцёраў Станіслава і Марыяны Закрэўскіх (продкі жонкі Станіслава Манюшкі) (гл. "К" № 26, 2020).

СВОЙ ХЛЕБ, СЯБРЫ І ПАЭЗІЯ

Сціплы "радзівілаўскі" заробак дробнага архіўнага працаўніка не дазваляў Яну Чачоту весці раскошны лад жыцця, але ўсё ж такі ён гарантаваў "кавалак хлеба". Калі выпадала, працягваў наведваць лекцыі ва ўніверсітэце. Праўда, на атрыманне нейкай навуковай ступені эпізадычныя візіты надзеі не давалі. Затое была магчымасць шчыльна кантактаваць са старымі і новымі сябрамі — Адамам Міцкевічам, Тамашом Занам, Адамам Сузіным, Ігнатам Дамейкам, Ануфрыем Петрашкевічам, Францішкам Малеўскім (брат Зосі, "музы" Яна Чачота) і многімі іншымі славутымі прадстаўнікамі аб'яднанняў філаматаў, філарэтаў. І не проста кантактаваць, а прымаць самы чынны ўдзел у жыцці гэтых таварыстваў, у якія ўваходзіла перадавая моладзь з зямель усяго былога ВКЛ і, пераважна, з беларускіх земляў.

У гэты перыяд расквітнеў паэтычны талент Яна Чачота, які гартаваўся ў няпростых паэтычных спаборніцтвах з сябрамі. Тады ж з'явіліся і першыя беларускія вершы Чачота.

Працяг будзе.

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 397 01 63 (экскурсійнае бюро)

Пастаянныя экспазіцыі:

- "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
- "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
- "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
- "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
- "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
- "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".

Выставы:

- Выстава **"Вялікія мары маленькіх людзей"**. (жывапіс Валянціна Губарава) — да 18 ліпеня.

- Выстава **"Фелікс Гумен. Класіка і эксперыменты. Да 80-годдзя майстра акварэлі"** — да 11 ліпеня.
- **"Фердынанд Рушчыц"**: віртуальная выстава да 150-годдзя з дня нараджэння.
- Віртуальная выстава твораў Віталя Чарнабрысава **"Вангогісты Гаген"**.
- Выстава **"Літаратурны пейзаж"** (графіка з фондаў Дзяржаўнага мемарыяльнага гісторыка-літаратурнага і прыродна-ландшафтнага музея-запаведніка А.С. Пушкіна "Міхайлаўскае" — да 15 жніўня.
- Выстава Уладзіміра Мурахвера "Шкло", прымеркаваная да 90-годдзя з дня нараджэння — да 30 жніўня.

Філіялы музея

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.
Тэл.: 358 88 78

Пастаянныя экспазіцыі:

- **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
- **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
- **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстава **"Повязь часоў"**, якая знаёміць з багаццем вобразаў традыцыйнага ручніка.
- **Займальныя майстар-класы** па саломапляценню, вырабу традыцыйных лялек, пляценні паясоў (бранзалетаў). Патрапіць на майстар-клас можна ў любы працоўны дзень музея: серада-нядзеля з 10.00 да 17.00. Папярэдні запіс абавязковы.
- Фотапраект італьянскага мастака Паола Ладамада **"AFRICA SOUL"** — да 31 жніўня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск,вул. Някрасава, 3
Тэл.: 399-09-79
Час працы: серада-нядзеля цз 12:00 да 20:00

- Выстава-вынік праекта **"Чорным па белым"**.

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47
Тэл.: 242-78-14
Час працы: аўторак-нядзеля 12.00-20.00

- Міжнародная выстава **"Гравюра без межаў"** — да 11 ліпеня.
- Выстава Фёдара Шурмялёва **"Эйдас"** — да 11 ліпеня.
- Выстава жывапісу Алены Шлегель **"Калекцыя ілюзій"** — да 11 ліпеня.
- Выстава дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Алы Непачаловіч **"Патаемнае"** — да 11 ліпеня.
- Выстава **"GENIUS LOCI. GENIUS LOST"** — да 1 жніўня.
- Выставачны праект "Адкрыты праект VL" — да 29 жніўня.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8. Тэл. +375 (17) 203 07 92, +375 (29) 144 07 92, +375 (17) 327 11 66. Музей працуе: аўторак, серада, пятніца, субота, нядзеля — з 10.00 да 18.00 (касы да 17.30), чацвер — з 12.00 да 20.00 (касы да 19.30) панядзелак — выхадны.

- Пастаянная экспазіцыя.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; +37529 551 80 51, + 37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выставачны праект **"Захавальнікі"** (куфры, шкатулкі, скрыні) — да 20 верасня.
- Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара"**. У складзе пастаяннай экспазіцыі.

Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
Вул. Гейсіка, 1.

- Выстава работ Аксаны Аракчэевай **"Зямля красуе добрымі людзьмі"** — да 15 ліпеня.

Ратуша
г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3.

- Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"



г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 90, (8–01596) 2 82 70.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Тэатралізаваная экскурсія **"Мірскі замак і яго ўладальнікі: шлях праз стагоддзі"**.
- Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку"**.
- Экскурсія з элементамі анімацыі і дэгустацыі **"Мірскі замак. Гісторыя. Культура. Дэгустацыя"**.
- Тэматычная экскурсія з элементамі квэста для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
- Музейныя камунікатыўныя праграмы: **"Табе, нашчадак, у добры дар…"**, **"Ад усяго сэрца — самы лепшы пачастунак"**, **"Капрызы моды ракако"**.
- Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку"**.
- Правядзенне вясельных цырымоній, святкаванне гадавіны вяселля.
- Музейная фотапляцоўка.
- **Квэст "Таямніца двух куфраў"**.

ПА ПЫТАННЯХ РАЗМЯШЧЭННЯ РЭКЛАМЫ Ў ГАЗЕЦЕ "КУЛЬТУРА" звяртайцеся па тэлефоне + 375 17 286 07 97 і па тэлефоне/факсе +375 17 334 57 41 альбо пішыце на электронны адрас kultura@tut.by!

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс: 290 60 10.

- Галоўны праект рэспубліканскага фестывалю манументальнага мастацтва Беларускага саюза **"Манумент"**

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

магазіны "Белсаюздрук"	кіёскі "Белсаюздрук"
Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".	ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.
Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".	Праспект Пераможцаў, 5.
Праспект Незалежнасці, 44.	Вуліца Рабкораўская, 17.
Вуліца Валадарскага, 16.	Праспект Незалежнасці, 68, В.
	Вуліца Лабанка, 2.

Тэлефон для даведак па наяўнасці газеты ў кіёсках "Белсаюздрук" — (017) 2764542 (з 9.00 да 17.30)

На Дзень народзінаў Купалы

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы запрашае разам адсвяткаваць Дзень нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы! У 49 раз на малой радзіме Песняра на гасцінная Маладзечанскай зямлі ў Купалаўскім мемарыяльным запаведніку "Вязынка" адбудзецца Рэспубліканскае свята паэзіі, песні і народных рамёстваў "З адною думкаю аб шчасці Беларусі…" (ужо сёння, 10 ліпеня, пачатак а 13 гадзіне).

Філіял музея "Вязынка" — незвычайна прыгожае месца з сапраўдным нацыянальным каларытам. Вершы-прысвячэнні Янку Купалу, маляўнічай Вязынцы і чароўнай Купальскай ночы прагучаць з вуснаў беларускіх літаратараў, якія традыцыйна возьмуць удзел у свяце.

Спецыяльныя госці: салісты і артысты аркестра Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь з тэатралізаваным канцэртам "Росквіт зямлі", натхнёным традыцыйным святам "Купалле" (рэжысёр Дар'я Пататурка), а этнічны гурт "Арацэя" з канцэртнай праграмай "Як для света грае лета" падзеліцца добрай энергетыкай і пазітывам.

Свята ў Вязынцы — выдатны дзень для сямейнага адпачынку, а 10-метровая фотазона заўсёды прадстаўляе магчымасць зафіксаваць яго не толькі ў памяці.

А 11 ліпеня а 10-й гадзіне супрацоўнікі музея запрашаюць далучыцца да правядзення традыцыйнага мерапрыемства — Купалаўскага фэсту, які адбудзецца ў парафіі Святой Тройцы ў Радашковічах.

У Беларусі Янку Купалу не забываюць. Вязынка, Яхімоўшчына, Акопы, Ляўкі — сляды прысутнасці паэта, якія захаваліся на беларускай зямлі.

Вельмі важна, каб памяць пра Янку Купалу жыла ў сэрцы кожнага беларуса, бо як сказаў Уладзімір Караткевіч: "Лепшы помнік Янку Купалу — нашы сэрцы і яго песні, што жывуць у іх. Зрабіце гэта не для яго, бо яго славу не ўзвялічаць помнікі. Зрабіце гэта для сябе, каб нас не вінавацілі ў няўдзячнасці, у дрэннай памяці, у адсутнасці вялікай павагі да лепшага свайго паэта, без якой не жывы кожны народ".

К

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.
Вечары Вялікага ў замку Радзівілаў

- **11 — "Дзікае паляванне карася Стаха"** (опера ў 2-х дзеях) Уладзіміра Солтана. Дырыжор — Андрэй Іваноў. Пачатак у 18.00.

Пачатак у 19.30.

- **12 — "Дзікае паляванне карася Стаха"** (опера ў 2-х дзеях) Уладзіміра Солтана. Дырыжор — Андрэй Іваноў. Пачатак у 19.00. Заканчэнне сезона.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

- **17 — "Лялечны карагод"** (інтэрактыўна-пазнавальны спектакль на 1 дзею). Пачатак у 16.00.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").